

ХТО І ЯК ЗАХОЎВАЕ КІТАЙСКУЮ ВАКЦЫНУ

3

ЧАМУ ВАРТА НАВЕДАЦЬ ПІНСК

11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 ВЕРАСНЯ 2021 г. СЕРАДА № 172 (29541)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КАРАНІК, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:**

*«Дыялог паміж людзьмі і органамі дзяржкіравання заўсёды быў у зоне пільнай увагі. Апошнім часам фармат такіх стасункаў пашырыўся — з'явіліся дыялогавыя пляцоўкі, нефармальныя сустрэчы, семінары. Але пры гэтым важнасць прамых ліній і асабістых прыёмаў не зніжаецца. Яны ахопліваюць свой спектр пытанняў, якія хвалююць людзей, часта дазваляючы вырашыць праблемную сітуацыю аператыўна, без цяганіны. Пры гэтым, часам здараецца і падмена паняццяў. Некаторыя думаюць, што зварот на прамую лінію можа, напрыклад, адмяніць рашэнне суда. У такім выпадку вельмі важна карэктна растлумачыць, што ўсе рашэнні прымаюцца выключна ў рамках заканадаўства».*

# Бахча — гэта па-беларуску!



Фота БелТА.

Вось такія вялізныя кавуны выраслі на поўдні нашай краіны, у Гомельскім раёне. У фермерскай гаспадарцы «Бахча Грынько» пад бахчавыя культуры ў вёсцы Цагельня ададзена дзевяць гектараў. Кавуны гаспадар Ігар ГРЫНЬКО з сям'ёй *(на гэтым фота яго дачка Хрысціна)* вырошчвае ўжо сем гадоў, прычым паспяхова — сёлета паласатыя ягады пацягнулі на 35-40 кілаграмаў кожная. Але яшчэ больш парадавалі гарбузы, якія Грынько сёлета пасадзілі ўпершыню, — адзін з іх вымахаў больш за 400 кіло! Буйны ўраджай адправілі на ўсерасійскую выстаўку «Аграбатл-2021» у Стаўрапольскі край — там гарбуз-гігант з Беларусі заняў другое месца. І хто цяпер скажа, што бахча — паняцце не беларускае?

## КОРАТКА

- **Фестываль кавуна пройдзе ў Гомелі 11 верасня.**
- Больш за 15 тысяч артылерыйскіх снарадаў знайшлі ў Докшыцкім раёне.



- **Тыдзень спорту і здароўя стартаваў у Беларусі.**
- Якой была сталіца больш за 80 гадоў таму, пакажа музей Якуба Коласа да Дня горада.
- **Віцебскі абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2021» адбудзецца ў Шуміліне 18 верасня.**

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

Жывіце ў бяспецы!

# З агнём не жартуюць,

### або Закрыццё дачнага сезона без надзвычайных сітуацый

**Завяршаецца дачны сезон. Гледзячы па надвор'і, заканчыцца ён раней, чым звычайна. Найбольш добрасумленныя гаспадары ўжо паступова рыхтуюць свае прысядзібныя тэрыторыі, а таксама дачныя ўчасткі да зімы. Каб навядзенне парадку на зямлі прайшло без інцыдэнтаў і не вылілася ў трагедыю, ратавальнікі раяць прыслухацца да іх рэкамендацый.**



Фота з адкрытых крыніц.

### Вогнішча — падалей ад будынкаў

Самы бяспечны спосаб справіцца са смеццем, якога восенню асабліва шмат, — утылізаваць яго на палігоне цвёрдых бытавых адходаў. Пра такія месцы, вядома, ведае не кожны гаспадар прысядзібнага ўчастка. А калі хто і ў курсе, то наўрад ці калі-небудзь вазіў туды сваё смецце. Прасцей жа распаліць вогнішча ў сябе на падворку ды пазакідваць туды ўсё, што непатрэбна.

Ніхто не забараняе распальваць агонь на тэрыторыі прыватнай уласнасці. Галоўнае, нагадваюць ратавальнікі, рабіць тое з выкананнем правілаў пажарнай бяспекі.

СТАР. 3

Сучасны падыход

# ЭКАЛАГІЧНА БЯСПЕЧНЫЯ І ЭКАНАМІЧНА ЭФЕКТЫЎНЫЯ

### Смецце будзе пераўтварацца ў паліва, энергію і прадукцыю

**Нацыянальнай стратэгіяй па абарачэнні з цвёрдымі камунальнымі адходамі (ЦКА) і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі (ДМР) у Беларусі плануецца ў 2025 годзе выкарыстоўваць 64 % ад усяго смецця, якое ствараецца, у 2030-м — 70 %, а ў 2035-м — уцягнуць у зварот да 90 % адходаў. Мяркуецца ўкараніць біялагічную апрацоўку адходаў — іх анаэробнае кампасціраванне — ў Гродне, Магілёве і 20 гарадах з насельніцтвам больш за 50 тысяч чалавек. У планах таксама — стварэнне 30 аб'ектаў па сарціроўцы і дадатковых вытворчасцяў па перапрацоўцы пластмас. Ужо сёлета ў Мінску павінна адкрыцца лінія па сарціроўцы змешаных адходаў і перастануць існаваць усе смеццевыя міні-палігоны.**

СТАР. 7



ISSN 1990 — 763X

Наталля КАЧАНАВА:

# «Сёння Беларусь вымушаная супрацьстаяць непрыкрытаму эканамічнаму і палітычнаму прэсінгу»

**Старшыня Савета Рэспублікі выступіла на 5-й Сусветнай канферэнцыі спікераў парламентаў з заклікам аб неўмяшанні ва ўнутраныя справы Беларусі і супрацьдзеянні дэзынфармацыі ў інтэрнэце.**

Нагадаем, што 7—8 верасня ў Вене пад эгідай Міжпарламенцкага саюза, Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і Парламента Аўстрыі праходзіць Сусветная канферэнцыя спікераў парламентаў на тэму «Спікеры парламентаў за больш эфектыўны шматбаковы падыход для забеспячэння міру і ўстойлівага развіцця дзеля карысці чалавецтва і планеты».

Традыцыйна такія канферэнцыі праводзяцца Міжпарламенцкім саюзам раз на пяць гадоў. Папярэдняя, чацвёртая, Сусветная канферэнцыя спікераў парламентаў праходзіла ў 2015 годзе ў Нью-Ёрку. Наступная сустрэча павінна была адбыцца ў 2020 годзе, аднак была перанесена ў сувязі з пандэміяй каранавіруснай інфекцыі.

На Пятай Сусветнай канферэнцыі спікераў парламентаў абмяркоўваюцца пытанні рэагавання на пандэмію COVID-19, супрацьдзеянне дэзынфармацыі і распальванню нянавісці ў інтэрнэце і афлайн, дасягнення Мэт устойлівага развіцця. Канферэнцыя завершыцца прыняццем дэкларацыі.

У прыватнасці, Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава накіравала зварот да ўдзельнікаў мерапрыемства, у якім яна выказала ўпэўненасць, што вялікую ролю ў барацьбе з пандэміяй можа адыграваць міжнароднае супрацоўніцтва, у тым ліку па лініі парламентаў, накіраванае на абмен інфармацыяй і перадавым вопытам, а таксама забеспячэнне ўсеагульнага доступу да вакцыны.

— Ва ўмовах пандэміі рэзка і жорстка змяняюцца правілы гульні на сусветнай палітычнай арэне, небяспечна разбураецца архітэктура міжнароднай бяспекі, закладзеная пасля Другой сусветнай вайны, — падкрэсліла спікер верхняй палаты беларускага парламента. — Не выконваюцца асноўныя геапалітычныя дамоўленасці, у міжнародных справах усё больш дамінуе палітыка сілы і агрэсіі.

Наталля Качанава падкрэсліла: наша краіна адчула гэта ў поўнай меры пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года.

— Сёння Беларусь вымушаная супрацьстаяць непрыкрытаму эканамічнаму і палітычнаму прэсінгу, мэтанакіраванаму ўмяшанню ва ўнутраныя справы, — акцэнтавала яна ўвагу ўдзельнікаў саміту.

Спікер адзначыла відавочны факт: не ўсіх у свеце задавальняюць стабільнасць і спакой у Беларусі, міралюбівая знешняя палітыка нашай дзяржавы, статус донара еўрапейскай бяспекі і перагаворнай пляцоўкі, у тым ліку і для «нармандскай чацвёркі».

— Дзеянні краін Захаду, накіраваныя, перш за ўсё, на дэстабілізацыю сітуацыі ў Беларусі шляхам увядзення новых эканамічных санкцый, падрываюць асновы міжнароднага права, пагражаюць міжнароднаму міру і ўстойліваму развіццю не толькі Беларусі, але і рэгіёна ў цэлым, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Яна паведаміла: беларускія парламентарыі неаднаразова ў сваіх заявах і каментарыях звярталіся да заходніх калег, каб заахвоціць іх урады не парушаць нормы міжнароднага права ў дачыненні да Рэспублікі Беларусь. У прыватнасці, у ліпені 2020 года сенатары і дэпутаты ўсіх узроўняў — а гэта 18 тысяч чалавек — звярнуліся да сусветнай супольнасці з заклікам выступіць супраць неабгрунтаванай, контрпрадуктыўнай і дыскрымінацыйнай палітыкі ў дачыненні да беларускай дзяржавы і яе народа, праявіць салідарнасць у адстойванні права на мірнае жыццё, вярнуцца да адказнага і плённага ўзаемадзеяння на карысць усіх краін.

Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што Беларусь выступае за пошук шляхоў аслаблення геапалітычнай напружанасці і ўмацавання міжнароднай бяспекі. У сувязі з гэтым яна звярнула ўвагу ўсіх удзельнікаў канферэнцыі на вылучаную кіраўніком беларускай дзяржавы ініцыятыву аб неабходнасці запуску глабальнага дыялогу па бяспецы. У мэтах яе прасоўвання ў Мінску праведзены шэраг міжнародных мерапрыемстваў высокага ўзроўню.

— У кантэксце працідзеяння новым выклікам прыярытэтнай з'яўляецца тэма барацьбы з міжнародным тэрарызмам, у тым ліку ў кіберпрасторы, — лічыць Наталля Качанава.

Яна падкрэсліла: інтэрнэт з'яўляецца найважнейшым элементам сучаснага жыцця. Яго імклівае развіццё адкрывае шырокія магчымасці для прагрэсу і, адначасова, выкарыстання тэхналогій у злачынных мэтах — у інфармацыйных і гібрыдных войнах, кампаніях па дэзынфармацыі і распальванні нянавісці.

— Рэспубліка Беларусь у поўнай меры адчула гэта на сабе падчас леташніх прэзідэнцкіх выбараў і спробы ажыццяўлення дзяржаўнага перавароту, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Аднак мы выстаялі дзякуючы палітычнай волі і мужнасці Прэзідэнта Беларусі, згуртаванасці вакол яго значнай часткі беларускага грамадства і суверэнітэту.

Яна звярнула ўвагу: наспела вострая неабходнасць у выпрацоўцы пад эгідай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый узгодненых міжнародных падыходаў па рэгуляванні дзейнасці ў інтэрнэце. І ў гэтым пытанні сваё слова павінны сказаць парламентарыі і Міжпарламенцкі саюз.

У дадзеным кантэксце спікер верхняй палаты беларускага парламента звярнула ўвагу яшчэ на адну міжнародную ініцыятыву Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі — сфарміраваць «пояс лічбавага добрасуседства».

— Заклікаю калег далучыцца да яе праз падпісанне пагадненняў аб міжнароднай інфармацыйнай бяспецы на аснове захавання лічбавага суверэнітэту і нейтралітэту, а таксама неўмяшання краін у інфармацыйныя рэсурсы адна адной, — адзначыла спікер.

Яна перакананая: стварэнне дакладнай міжнароднай прававой базы ў сферы інфармацыйнай бяспекі будзе спрыяць, у тым ліку, эфектыўнаму супрацьдзеянню дэзынфармацыі і распальванню нянавісці ў інтэрнэце і рэальным жыцці.

Трэба сказаць, што ў нацыянальным заканадаўстве Беларусі ўжо ўведзены такія навацыі: вызначаны меры па абароне нацыянальнай інфармацыйнай прасторы ў медыясферы, пашыраны пералік відаў інфармацыі, распаўсюджванне якой забаронена, удасканалены падыходы да дзяржаўнай рэгістрацыі і перарэгістрацыі сродкаў масавай інфармацыі.

— Пандэмія і барацьба з новымі выклікамі і пагрозамі не павінны стаць прычынай невыканання Мэт устойлівага развіцця на перыяд да 2030 года, — упэўнена Наталля Качанава. — У Беларусі агульную каардынацыю па дасягненні гэтых мэт ажыццяўляе спецыяльная парламенцкая рабочая група. Летась наша краіна ўмацавала свае пазіцыі ў рэйтынгу індэкса дасягнення мэт і паднялася з 23-га на 18-е месца сярод 166 краін.

— Прыклад лідарства Парламента ў рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця заслугоўвае выкарыстання заканадаўчай уладай іншых краін, — лічыць Старшыня Савета Рэспублікі.

Яна акцэнтавала ўвагу калег: устойлівае аднаўленне пасля пандэміі будзе ў значнай ступені залежаць ад міжнароднага супрацоўніцтва і салідарнасці, і ў першую чаргу, ад наяўнасці справядлівай, адкрытай і празрыстай сусветнай гандлёвай сістэмы без эканамічных санкцый, ціску і ўмяшання ва ўнутраныя справы.

У канцы свайго выступлення парламентарый пажадала ўдзельнікам саміту плённай работы на пляцоўцы канферэнцыі для выпрацоўкі эфектыўных шматбаковых падыходаў для забеспячэння міжнароднага міру і ўстойлівага развіцця дзеля карысці чалавецтва і планеты.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Меркель умешваецца ў выбарчую кампанію



**Канцлер ФРГ Ангела Меркель вырашыла зноў асабіста падтрымаць кандыдата ад сваёй партыі, Хрысціянска-дэмакратычнага саюза, Арміна Лашэта і раскрытыкавала яго галоўнага саперніка на будучых выбарах, лідара Сацыял-дэмакратычнай партыі (СДПГ) Олафа Шольца. Пра гэта піша Bloomberg.**

Як адзначае выданне, падобнае прамое ўмяшальніцтва ў выбарчую кампанію з боку Меркель выглядае незвычайна, нават нягледзячы на той факт, што да выбараў засталося менш за тры тыдні.

Меркель выступіла ў Бундэстагу са сваёй апошняй афіцыйнай прамовай, падчас якой заявіла, што ўрад на чале з Лашэтам і ХДС стане найлепшым выбарам для Германіі. «Яго ўрад будзе выступаць за стабільнасць, надзейнасць і стрыманасць», — заявіла яна, падкрэсліўшы, што мае вялікае значэнне, хто менавіта кіруе краінай.

У той жа час дзеючы канцлер раскрытыкавала апошнія заявы Шольца. У прыватнасці, яна асудзіла словы лідара СДПГ пра магчымасць стварэння кааліцыі паміж яго партыяй і антыкапіталістычнай Левай партыяй. Акрамя таго, Меркель негатыўна ацаніла выказванні Шольца аб тым, што кампанія па вакцынацыі ад каранавіруса ў Германіі носіць «эксперыментальны характар».

### Шайгу мог абмеркаваць з Пуціным ідэю аб новых гарадах у Сібіры

**Прэс-сакратар прэзідэнта РФ Дзмітрый Пяскоў лічыць, што міністр абароны Сяргей Шайгу, напэўна, канцэптуальна абмеркаваў з прэзідэнтам Уладзімірам Пуціным сваю ідэю аб будаўніцтве новых гарадоў у Сібіры.**

Шайгу на сустрэчы з навуковай грамадскасцю ў новасібірскім Акадэмгарадку заявіў, што лічыць неабходным пабудаваць у Сібіры тры, а лепш пяць буйных гарадоў з насельніцтвам ад 300 тысяч чалавек да 1 мільёна, прычым зрабіць іх канкрэтна накіраванымі на тую ці іншую сферу дзейнасці — напрыклад, на энергамашынабудаванне, лесаперапрацоўку або нафтахімію. Прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін на сустрэчы з прадстаўнікамі партыі «Адзіная Расія» заявіў, што трэба падрыхтаваць і аформіць прапановы па развіцці Сібіры, якія агучыў кіраўнік ваеннага ведамства.

Пазней у інтэрв'ю РБК Шайгу заявіў, што новыя гарады ў Сібіры могуць пабудаваць паміж Брацкам і Краснаярскам, а таксама ў раёне Канска і Лесасібірска.

### Вучоныя папярэдзілі аб небяспечным наступстве каранавіруса

**Органы людзей, якія перанеслі каранавірусную інфекцыю, могуць старэць на дзесяцігоддзі раней. Да такой высновы прыйшлі вучоныя, піша The New York Times.**

Даследаванне закранула каля 90 тыс. чалавек, якія перахварэлі на COVID-19, і больш за 1,6 млн людзей, што не сутыкаліся з гэтай інфекцыяй. Назіранні праводзіліся ананімна па медыцынскіх запісах Упраўлення аховы здароўя ветэранаў ЗША, а пацыенты былі пераважна белыя мужчыны з сярэднім узростам 68 гадоў.

Спецыялісты нагадалі, што ў здаровага дарослага чалавека ва ўзросце 30—40 гадоў страта функцыі нырак складае каля 1 % на год. Сур'ёзныя інфекцыі прыводзяць да больш моцных, часам незваротных страт для гэтага органа або становяцца прычынай хранічнага захворвання. У ходзе даследавання высветлілася, што ў 4757 пацыентаў, якія перанеслі каранавірус, адбылася 30-працэнтная страта функцыі нырак на працягу аднаго года, што эквівалентна старэнню органа на 30 гадоў.

Пакуль дакладнай прычыны таго, чаму менавіта ныркі моцна церпяць з-за COVID-19, урачы не ведаюць.

Меркаванне

## «Так распарадзіўся лёс»



**Думкамі пра новае беларускае свята — Дзень народнага адзінства — дзеліцца Расціслаў ЦІМАФЕЕЎ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі і культурнай спадчыны Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава.**

«Любая дзяржава, які б перыяд гісторыі мы ні ўзялі, імкнецца ўсімі магчымымі шляхамі ўмацаваць сваё становішча ва ўсіх наяўных сферах. Рэспубліка Беларусь, натуральна, ніякага выключэння апрыёры не прадстаўляе, бо робіць усё магчымае, каб даць сваім грамадзянам максімальна камфортны рэжым для пражывання.

Адной з найважнейшых сфер развіцця сучаснага беларускага грамадства з'яўляецца ідэалагічная, на ўзмацненне ўплыву якой і накіраваны Дзень народнага адзінства ў нашай краіне», — разважае выкладчык.

Ён лічыць, што ва ўмовах сацыяльна-эканамічнага і палітычнага становішча, якое пастаянна змяняецца ў сучасным свеце, менавіта ідэалагічны і маральны складнікі нашага грамадства могуць быць і будуць тымі стрыжнямі, на якіх мацуецца беларуская дзяржаўнасць.

А укараненне ў масавую грамадскую свядомасць дадатковай ідэйнай матывацыі, звязанай з Днём народнага адзінства, будзе спрыяць лепшаму разуменню насельніцтвам важнасці для дзяржаўнай стабільнасці працэсаў, якія адбываюцца ў краіне.

Дзень народнага адзінства, як і іншыя крокі ў ідэалагічнай сферы, будзе садзейнічаць больш выразнаму і ўстойліваму фарміраванню ў насельніцтва цвёрдай жыццёвай пазіцыі, што асабліва актуальна для нашай моладзі.

Расціслаў Цімафееў упэўнены, што больш удалай даты для святкавання Дня народнага адзінства, чым 17 верасня, у сучаснай гісторыі Беларусі не існуе ў прынцыпе. «Так распарадзіўся лёс нашага беларускага народа, які быў раз'яднаны сілай многіх негатыўных для яго абставін у 1921 годзе і з'яднаны ў 1939-м.

Уз'яднанне беларускага народа ў адзінай дзяржаве 17 верасня 1939 года з'яўляецца крокам высокай гістарычнай справядлівасці, калі беларусы сталі роўнымі ў сваіх правах, свабодах, магчымасцях».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# З агнём не жартуюць...


Фота з адкрытых крыніц.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Калі вы збіраецеся паліць сваё смецце, важна ўлічваць надвор'е, — папярэджвае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Ні ў якім разе гэта нельга рабіць тады, калі на вуліцы вецер: дастаткова секунды, каб кантралюемае вогнішча перарасло ў з'яву, якая выйшла з-пад кантролю. Калі ж надвор'е спрыяе, перад тым як распальваць агонь, варта паставіць побач з вогнішчам вядро з вадой, штыкавую рыдлёўку. Выдатна, калі будзе ў вас і вогнетушыцель.

Акрамя таго, выбіраючы месца для распальвання агню, неабходна выключыць магчымасць загарання найбліжэйшых хат, а таксама сельскагаспадарчых пабудоў. Для таго каб не дапусціць распаўсюджвання агню, месца вогнішча трэба абкапаць. І яшчэ: калі ў вас нешта гарыць, нікуды не адхіляйцеся — за вогнішчам неабходна ажыццяўляць пастаянны кантроль.

Пасля таго як яно патушана, вельмі важна добра праліць гэтае месца вадой. Выпадкі, калі вуглі становяцца прычынай апёкаў, нячастыя, але здараюцца. Некалькі гадоў таму, напрыклад, гарачымі вуглямі абсыпаліся малыя дзеці. Такая небяспечная гульня скончылася для аднаго з іх шпіталізацыяй.

**ПРЫ ЭКСПЛУАТАЦЫІ ПЕЧАЎ НЕ ДАПУСКАЕЦЦА:**

- іх перагравацъ;
- ажыццяўляць паленне пры наяўнасці абвальвання кладкі;
- прымяняць для распальвання вогненебяспечныя і гаручыя вадкасці;
- паліць у печы з адчыненымі дзверцамі, за выключэннем выпадкаў, калі канструкцыя печы прадугледжвае яе паленне з адчыненай камерай;
- размяшчаць гаручыя рэчывы і матэрыялы на іх, а таксама ў непасрэднай блізкасці ад топачных адтулін для палення;
- пакідаць без нагляду печы, якія выкарыстоўваюцца.

## Наводзіў парадак — атрымаў апёкі

Як паказвае практыка, калі пачынаецца ўзгаранне, людзі нярэдка губляюцца. У асноўным, няздольныя аператыўна рэагаваць на надзвычайную сітуацыю людзі пажылога ўзросту. Часам гэта прыводзіць да таго, што пасля такога навядзення парадку на зямлі ёсць загінулыя. У найлепшым выпадку ўсё заканчваецца апёкамі.

На ўласным вопыце гэта зведаў адзін з мясцовых жыхароў пасёлка Чарніцкі, што ў Смалявіцкім раёне. Мужчына дапамагаў аднасяльчанцы наводзіць парадак на падворку. Калі агонь выйшаў з-пад кантролю, сказаць дакладна пацярпелыя не могуць. Затое добра памятаюць, з якой хуткасцю вогненная стыхія пачала распаўсюджвацца па тэрыторыі прысядзібнага ўчастка — у выніку агонь ахапіў 300 квадратных метраў сухой расліннасці. Да прыбыцця ратавальнікаў тушыць пажар спрабавала мясцовае насельніцтва. Мужчына, які дапамагаў гаспадыні пазбавіцца ад смецця, атрымаў тэрмічныя апёкі рук і ног (да 35 % цела). Пацярпелы быў дастаўлены ва ўстанову аховы здароўя.

У апёкавае аддзяленне той жа, Смалявіцкай цэнтральнай раённай бальніцы, са шматлікімі апёкамі цела быў шпіталізаваны днямі і грамадзянін 1956 года нараджэння. Як потым высветлілася, мужчына выкарыстоўваў пры распальванні вогнішча на прыватнай тэрыторыі газавы балончык. У выніку ўспышкі пароў вогненебяспечнай вадкасці на ім загарэлася адзенне, якое пацярпелы патушыў з дапамогай падручных сродкаў. Пасля пенсіянер выклікаў брыгаду хуткай дапамогі.

## Каб шашлыкі праз бок не выйшлі

Супрацоўнікі МНС не перастаюць папярэджваць: пры распальванні вогнішча не варта выкарыстоўваць вогненебяспечныя і гаручыя вадкасці. У такіх сітуацыях лепш звярнуцца да старых праверанных спосабаў.

Менавіта з-за гэтых нававмодных метадаў распальвання непрыемнасцямі часта заканчваецца і жаданне паесці на прыродзе шашлыкоў. Надоечы, напрыклад, у бальніцу трапіў мужчына з апёкамі 21 % цела — на прыватным падворку ў пасёлку Рудзенск, што на Пухавіччыне, пацярпелы спрабаваў распаліць мангал.

— Каб падобныя сітуацыі больш не паўтараліся, аматарам шашлыкоў варта ўстанаўліваць мангал правільна і выконваць усе рэкамендацыі пры распальванні вогнішча, — удакладняе афіцыйны прадстаўнік МНС. — Тым, хто рамантуе аўтамабілі, нельга забывацца, што перш чым падыходзіць да мангала, лепш пераапрануцца: моцна прамасленая вопратка можа ўспыхнуць як запалка.

Асаблівую ўвагу ратавальнікі звяртаюць на бяспеку дзяцей. Неабходна сачыць за тым, каб малыя не падыходзілі блізка да мангала або вогнішча. Варта растлумачыць дзецям, што нельга гуляць з агнём, а таксама кідаць туды шклянкі з-пад аэразоляў, лаку для валасоў і іншыя небяспечныя прадметы. Менавіта дзіцячае свавольства з агнём часта становіцца прычынай узгаранняў.

## Рыхтуйце печ загадзя

У многіх хатах дагэтуль выкарыстоўваецца пячное ацяпленне. І мала хто ведае, што менавіта цяпер самы час падрыхтаваць сваю печ да зімы. Гэта датычыцца нават тых, хто плануе прыехаць на дачу раз або два за зіму. З набліжэннем ацяпляльнага сезона варта звярнуць увагу і на жыллё пажылых бацькоў.

Печы, паверхні труб і сцены, у якіх праходзяць дымавыя каналы, павінны быць спраўныя, без скразных расколін. Каб вызначыць, ці ёсць яны ў коміне, перад эксплуатацыяй яго рэкамендуецца пабяліць. Акрамя таго, не трэба забываць ачышчаць коміны ад сажы.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ЧАКАНЫ ГРУЗ

### У Беларусь даставілі яшчэ 1,5 мільёна доз кітайскай вакцыны ад COVID-19

**У нядзелю ў Беларусь прыбыў самалёт з Пекіна з 1,5 мільёна доз вакцыны супраць COVID-19. З іх 500 тысяч доз кітайскі бок выдзеліў Беларусі ў якасці сяброўскай гуманітарнай дапамогі, а мільён доз быў закуплены нашай краінай. Учора ў Міністэрстве аховы здароўя прайшла ўрачыстая цырымонія падпісання дакументаў аб перадачы вакцыны Sinopharm. Ужо праз два-тры дні кітайская вакцына паступіць у рэгіёны.**

Подпісы пад дакументамі паставілі міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Се Сяаюн.

Дзмітрый Піневіч падкрэсліў глыбіню супрацоўніцтва дзвюх краін і нагадаў, што з моманту пачатку пандэміі Беларусь стала першай краінай, якая адправіла гуманітарны груз у Кітай.

— Першы груз быў адпраўлены 30 студзеня, а другі — 6 лютага. А калі ўжо мы сутыкнуліся з пандэміяй, КНР таксама аказала нам шырокамаштабную дапамогу. Мы супрацоўнічаем з 20 правінцыямі Кітая, вопыт гэтай краіны шырока выкарыстаны ў айчыннай практыцы. Наша краіна ўжо атрымлівала 400 тысяч доз кітайскай вакцыны ў якасці бязвыплатнай дапамогі двума траншамі, — расказаў Дзмітрый Піневіч.

Па словах Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі Се Сяаюна, трэцяя партыя вакцыны — канкрэтны крок па рэалізацыі дамоўленасцяў паміж кіраўнікамі дзвюх краін. Ён дэманструе высокі ўзровень адносін паміж дзяржавамі, глыбокае сяброўства паміж народамі. Кітай і ў далейшым мае намер развіваць плённае супрацоўніцтва з Беларуссю па барацьбе з каранавірусам.

Се Сяаюн адзначыў, што ў Кітайска-Беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень» цяпер працуе прадпрыемства, якое плануе вырабляць эфектыўныя прэпараты кітайскай традыцыйнай медыцыны.Там рэалізуецца праект па распрацоўцы сродкаў для эфектыўнага лячэння каранавіруса. Хутка пачнуцца клінічныя выпрабаванні.

Рэпартаж у нумар

# ПА НАЙЛЕПШЫХ МІЖНАРОДНЫХ СТАНДАРТАХ

### Як кітайскай вакцыне забяспечваюць камфортную тэмпературу, вільготнасць і іншыя ўмовы

**Частка вакцыны супраць COVID-19, днямі дастаўленая з Кітая ў Беларусь — а гэта 500 тысяч доз у межах сяброўскай гуманітарнай дапамогі — цяпер размешчана на складах транспартна-лагістычнага цэнтра «Мінск-Белмытсэрвіс-2». Асобны халадзільнік, спецыяльны тэмпературны рэжым, супрацоўнікі, якія пільна сочаць за бяспекай захоўвання — карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў ТЛЦ і на сваe вочы ўбачылі, якая ўвага аддаецца каштоўнаму грузу.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Са сталічнага аэрапорта, куды вакцына была дастаўлена самалётам, два аўтамабілі-рэфрыжэратары перавезлі яе пад Мінск. Тут размешчаны сучасны транспартна-лагістычны цэнтр аднаго з вядучых лагістычных аператараў краіны — РУП «Белмытсэрвіс». Менш за 20 хвілін прайшло з моманту заезду аўтамабіляў на складскую тэрыторыю да апускання дзвярэй халадзільнай секцыі. За такі кароткі час 29 паддонаў з вакцынай перамясцілі ў камфортныя і бяспечныя для яе ўмовы — як вядома, яна патрабуе нізкіх тэмператур пры перавозцы і захоўванні.

— У звычайным рэжыме разгрузка адной машыны займае ў сярэднім 40-45 хвілін. Мы справіліся ў чатыры разы хутчэй, калі ўлічыць, што было дзве машыны, — расказвае **намеснік дырэктара Мінскага філіяла РУП «Белмытсэрвіс» Раман ШОРАХАЎ.**

Трэба сказаць, што прафесіяналізм работнікаў, а іх, дарэчы, у мінскім філіяле «Белмытсэрвіса» каля 700, не выклікаў сумненняў і ў Міністэрства аховы здароўя, якое без ваганняў даверыла прадпрыемству каштоўны груз. Адметна, што «Белмытсэрвіс» захоўвае вакцыну на бязвыплатнай аснове.

Трэба сказаць, што сертыфікат, які дазваляе размяшчаць на сваіх складах любыя лекавыя і біяпрэпараты, ТЛЦ «Мінск-Белмытсэрвіс-2» атрымаў 29 сакавіка бягучага года. Гэта сістэма забеспячэння якасці для складскіх прадпрыемстваў у сферы абароту лекавых сродкаў, або належная дыстрыб'ютарская практыка (GDP). Умовы для захоўвання лекаў, якія адпавядаюць самым высокім міжнародным стандартам, былі прадугледжаны яшчэ падчас будаўніцтва комплексу. Яно вялося ў рамках развіцця транспартна-лагістычнага комплексу краіны і завяршылася ў 2013 годзе. Цяпер давялося дакупіць невялікую частку абсталявання і датчыкаў. Дарэчы, толькі іх штомесячнае абслугоўванне каштуе нятанна.

— Мы гатовыя да такіх затрат, бо гэта перспектыўны напрамак развіцця. І тое, што мы можам захоўваць любыя лекавыя прэпараты і падтрымаць такім чынам нашу медыцынскую галіну, дорага каштуе, — адзначае Раман Шорахаў.

Вакцына знаходзіцца ў камеры, асобна ад іншых лекавых прэпаратаў. Тэмпературны рэжым, а ён вызначаны для вакцыны ў 4 градусы, вільготнасць



і нават паток паветра тут адсочваюцца ў рэжыме 24/7. У выпадку ўзнікнення непаладак у абсталяванні спрацоўваюць датчыкі і інфармацыя імгненна паступае на манітор службы бяспекі, якая сочыць за функцыянаваннем комплексу. Акрамя таго, кантралёры кругласутачна ажыццяўляюць візуальны кантроль датчыкаў, якія размешчаны на халадзільных секцыях.

У цэлым жа сертыфікат GDP дае права захоўваць любыя лекавыя прэпараты. Склад часовага захоўвання ТЛЦ «Мінск-Белмытсэрвіс-2» мае халадзільныя камеры агульнай плошчай 180 $м^2$ з падтрымальным тэмпературным рэжымам +2 – +8, магчымасць падлогавага і стэлажнага захоўвання звыш 600 $м^3$. З прадпрыемствам ужо супрацоўнічае каля дзясятка фармвытворцаў. Агульная плошча складоў ТЛЦ «Мінск-Белмытсэрвіс-2» — каля 19 тысяч $м^2$.

Дарэчы, аналагічнае заключэнне GDP ужо маюць ТЛЦ «Магілёў-Белмытсэрвіс» і «Брэст-Белмытсэрвіс-2», у хуткім часе яго атрымае ТЛЦ «Гомель-Белмытсэрвіс».

А што датычыцца кітайскай вакцыны, то ў найбліжэйшыя дні са склада ТЛЦ яна пачне паступаць у рэгіёны. На ўсім яе шляху да спажыўца будуць забяспечаны неабходныя ўмовы транспарціроўкі і захоўвання.

**Алена КРАВЕЦ.**

# БОЛЬШ ЗА ПАЎСОТНЮ ЭКСПАРТНЫХ КІРУНКАЎ

## Размова з кіраўніком Пухавіцкага раёна пра створаныя ў рэгіёне ўмовы для людзей і бізнесу



**Пухавіцкі раён апошнія гады стабільна развіваецца, шмат зроблена ў вытворчай, сельскагаспадарчай, сацыяльнай сферах. Будуюцца новае жыллё, школы, дзіцячыя садкі, рэалізоўваюцца інвестыцыйныя праекты, шмат увагі аддаецца рабоце з кадрамі, маладымі спецыялістамі. А гэта значыць, павышаецца дабрабыт жыхароў раёна. Што зроблена, як будзе развівацца раён у сацыяльна-эканамічным плане расказаў «Звяздзе» старшыня райвыканкама Віктар КАЛЯДА.**

— У структурным плане эканоміка рэгіёна ўяўляе з сябе сістэму, у якой дамінуючае становішча належыць прамысловасці. Прамысловасць Пухавіцкага раёна — гэта больш за 100 арганізацый усіх формаў уласнасці, якія фарміруюць каля шасці працэнтаў аб'ёму прамысловай прадукцыі Мінскай вобласці, — расказвае Віктар Міхайлавіч. — За студзень—чэрвень 2021 года выраблена прамысловай прадукцыі на суму звыш 390 мільёна рублёў.

Прадпрымальніцкі сектар раёна прадстаўлены 2314 суб'ектамі малога і сярэдняга бізнесу, да ўзроўню 2019 года рост склаў каля 5 %. 239 фізічных асоб ажыццяўляюць рамесную дзейнасць, працуюць 34 суб'екты аграэкатурызму. Удзельная вага паступленняў у бюджэт ад суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва складае 40 %. У цэлым амаль на 70 % бюджэт фарміруецца за кошт адлічэнняў недзяржаўнага сектара эканомікі.

На долю Пухавіцкага раёна прыпадае 2,5 працэнта ад агульнага аб'ёму экспарту тавараў Мінскай вобласці, 1,8 працэнта — экспарту паслуг. Прадукцыя пастаўляецца больш чым у 50 краін свету. Асноўным гандлёва-эканамічным партнёрам з'яўляецца Расійская Федэрацыя з удзельнай вагой у экспарце раёна 62,7 %, затым ідуць Украіна — 17,7 %, Польшча — 4,9 %, Літва — 4,7 %, Казахстан — 3,2 %, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты — 0,9 %. У 2020-м было экспартавана тавараў амаль на 130 мільёнаў долараў, што перавысіла ўзровень 2010 года ў 3,5 раза, за пяць месяцаў 2021-га — 90 мільёнаў долараў. За мяжу ў асноўным ідуць хімічныя сродкі засцярогі раслін, мадэльныя саставы, парафін, дзіцячыя цацкі, ветэрынарныя прэпараты, марожанае. Галоўны экспарцёр тавараў — гэта ЗАТ «Аўгуст-Бел», якому належыць 64 % экспарта раёна. А таксама СТАА «Марозпрадукт», ТАА «Белэкатэхніка», ТАА «Краіна цацак». Экспарт паслуг у цэлым па раёне за пяць месяцаў 2021 года склаў 3,5 млн долараў, або 133 % да аналагічнага перыяду 2020 года.

Паступленне прамых замежных інвестыцый у рэгіён за першае паўгоддзе 2021 года — 28 мільёнаў долараў ЗША. Асноўнымі арганізацыямі, якія прыцягваюць прамыя замежныя інвестыцыі з'яўляюцца ЗАТ «Аўгуст-Бел», ЗАТ «Струнныя тэхналогіі».

Што датычыцца сельскай гаспадаркі, яна арыентавана на вытворчасць малака і мяса, вырошчванне збожжавых культур, рапсу, цукровых буракоў, бульбы. У цэлым вытворчасць валавой прадукцыі ў гэтай галіне за сем месяцаў 2021-га склала 105,4 % да ўзроўню 2020 года (пры даведзеным паказчыку 102,3 %). Вытворчасць малака за студзень — ліпень 2021 года павялічылася да ўзроўню мінулага года на 5 % і склала 49 тысяч тон.

***— Віктар Міхайлавіч, у раёне распрацавана Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2021—2025 гады. Што ў ёй закладзена?***

— Праграма прадугледжвае павелічэнне выкарыстання наяўнага патэнцыялу развіцця ўсіх галін народнагаспадарчага комплексу раёна, а таксама эфектыўнае выкарыстанне канкурэнтнай перавагі — развіццё горада-спадарожніка Мінска, гарадскога пасёлка Рудзенск.

Галоўная мэта праграмы — стварэнне асновы ўстойлівага росту эканомікі, умоў для павелічэння даходаў насельніцтва і забеспячэння камфортнага жыцця ў рэгіёне за кошт мадэрнізацыі і больш эфектыўнага выкарыстання прамысловага, аграрнага, турыстычнага і прыродна-рэсурснага патэнцыялаў. Перад рэгіёнам стаяць задачы па фарміраванні эфектыўнага аграпрамысловага комплексу шляхам аптымізацыі вытворчых плошчаў і тэхналагічнай мадэрнізацыі з тым, каб знізіць выдаткі і павялічыць аб'ёмы вытворчасцяў, а таксама фарміраванне інвестыцыйных пляцовак з неабходнай інфраструктурай. Вельмі важны і такі аспект, як прыцягненне інвестараў на сфарміраваныя пляцоўкі, замацаванне спецыялістаў у сельскіх населеных пунктах, моладзі. Гэта плануецца ажыццявіць шляхам будаўніцтва жылля і сацыяльнай інфраструктуры, у тым ліку ўзвядзення горада-спадарожніка.

***— Дасягненне азначаных мэт мае на ўвазе прыцягненне інвестараў, рэалізацыю інвестыцыйных праектаў...***

— Безумоўна. І мы працуем у гэтым кірунку. Напрыклад, Нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя рэалізоўвае інвестыцыйны праект па арганізацыі высокатэхналагічнай аграпрамысловай вытворчасці поўнага цыкла на 2016—2032 гады з аб'ёмам інвестыцый у памеры 1196 млн рублёў, што дазволіць стварыць больш за 800 новых рабочых месцаў. РУП «Мінскэнерга» ажыццяўляе інвестыцыйны праект па будаўніцтве пікава-рэзервовай энергакрыніцы на ЦЭЦ-5 — 1-я і 2-я чэргі з аб'ёмам інвестыцый каля 400 млн рублёў. Таксама плануецца да рэалізацыі будаўніцтва міжрэгіянальнага палігона ў пасёлку Дружны за кошт сродкаў Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця (5 мільёнаў еўра і 2 мільёны еўра гранты). Тэрмін увядзення ў дзеянне — 2022 год. Па распараджэнні кіраўніка дзяржавы створана новая арганізацыя — камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «ЭкаДругЗаб», якая з'яўляецца заказчыкам дадзенага праекта. На сёння праходзяць таргі па пошуку падрадчыка на праектаванне і будаўніцтва.

Усё гэта садзейнічае стварэнню новых рабочых месцаў. Так, за апошнюю пяцігодку іх адкрыта каля 1,5 тысячы.

***— Наколькі ведаю, у раёне актыўна вядзецца будаўніцтва жылля, сацыяльных аб'ектаў. І шмат што яшчэ запланавана?***

— У 2019 годзе распрацаваны горадабудаўнічы праект па аб'екце «Дэталёвы план планіровачнага раёна «Дружны» ў горадзе-спадарожніку Мінска, гарадскім пасёлку Рудзенск. 24 снежня 2019 года прынята рашэнне Пухавіцкага раённага выканаўчага камітэта аб зацвярджэнні горадабудаўнічай дакументацыі, якое прайшло юрыдычную экспертызу і апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь. Рашэнне ўступіла ў сілу 22 лютага 2020 года. Дадзеным дэталёвым планам прадугледжана будаўніцтва 2660 кватэр. Плануецца ўзвядзенне двух дзіцячых садкоў, школы, аб'ектаў культурна-бытавога прызначэння, фізкультурна-спартыўных, гандлёва-забаўляльных аб'ектаў, аб'ектаў інжынернай і транспартнай інфраструктуры і грамадска-дзелавога цэнтра.

Запланавана і будаўніцтва пажарнага дэпо ў Мар'інай Горцы на тэрыторыі былога ваеннага гарадка, якое завершыцца ў 2023 годзе. На дадзены момант распрацоўваецца праектная дакументацыя. А таксама — будаўніцтва лячэбнага корпуса па вуліцы Паркавай у пасёлку Дружны. Ужо вызначана праектная арганізацыя, заключаецца дагавор на правядзенне праектна-пошукавых работ.

На 2022 год запланавана шмат мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні. Такія, напрыклад, як уладкаванне вуліцы Кастрычніцкая. Тут прадугледжваецца арганізацыя перахопліваючай паркоўкі для грамадзян, якія прыбываюць на аўтавакзал, або чыгуначную станцыю на асабістым аўтамабільным транспарце. З'явяцца і месцы для стаянкі таксі, захоўвання ровараў з пунктам пракату, каля аўтастанцыі будзе добраўпарадкаваны сквер з месцамі для адпачынку пасажыраў усіх узростаў, якія чакаюць транспарту. Магчымае і размяшчэнне дзіцячай пляцоўкі.

***— А як справы з працаўладкаваннем і замацаваннем моладзі?***

— Штогод у раён прыбывае каля 250 маладых спецыялістаў. За кожным з іх замацоўваюцца адказныя асобы (настаўнікі), якія дапамагаюць моладзі адаптавацца ў калектывах, набыць веды і навыкі ў практычнай дзейнасці. Асноўная частка выпускнікоў навучальных устаноў — ураджэнцы Пухавіцкага раёна, пражываюць разам з бацькамі. Іншагароднім або тым, хто хоча жыць асобна, даецца жыллё, вылучаюцца месцы ў інтэрнаце. Спецыялістам, якія прыбылі ў сельскагаспадарчыя арганізацыі раёна, выдзяляецца жыллё гаспадаркі альбо кампенсуецца 50 % выдаткаў па аплаце здымных кватэр (дамоў). У далейшым яны маюць магчымасць набыць гэтыя «квадраты» ва ўласнасць пры ўмове наяўнасці стажу работы ў сельскагаспадарчых арганізацыях больш за дзесяць гадоў.

У 2020 годзе, напрыклад, для работнікаў Мар'інагорскай цэнтральнай раённай бальніцы выдзелена восем жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання, шэсць з іх для маладых спецыялістаў.

Маладым медыкам устанаўліваюцца працэнтныя надбаўкі за складанасць і напружанасць працы, а пры ўмове заключэння кантракта ад двух да пяці гадоў — павышэнне акладу на тэрмін да пяці гадоў. На працягу двухгадовай адпрацоўкі ўсім маладым спецыялістам аказваецца дапамога ў падрыхтоўцы дакументаў для здачы на кваліфікацыйную катэгорыю, што забяспечвае ў далейшым кар'ерны рост. Для аплаты здымнага жылля ім штомесяц выплачваецца матэрыяльная дапамога ў памеры трох базавых велічынь.

У сферы адукацыі працуюць «Школа маладога спецыяліста» першага года работы і «Школа маладога спецыяліста» другога года працы. Пасяджэнне Школы праводзіцца адзін раз на месяц, там разглядаюцца актуальныя пытанні. Для маладых спецыялістаў арганізоўваюцца круглыя сталы, семінары, вэбінары, праводзяцца мерапрыемствы, конкурсы. Падчас пасяўной і ўборачнай кампаній арганізоўваюцца спаборніцтвы сярод маладых механізатараў, маладзёжных экіпажаў уборачных агрэгатаў. Арганізацыямі раёна арандуюцца спартыўныя залы для заняткаў спортам, ладзяцца спартакіяды, турыстычныя злёты, спаборніцтвы пажарных і санітарных дружын.

Стварэнне неабходных умоў для прафесійнай і працоўнай самарэалізацыі маладых людзей з'яўляецца прыярытэтнай задачай у галіне рэгулявання сацыяльна-працоўных адносін у Пухавіцкім раёне.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Не прапусці!

# ФІЗІКА, ГЕНЕТЫКА, АТАМНАЯ ЭНЕРГІЯ... НА ПАЛЬЦАХ

## Фестываль навукі пройдзе ў Цэнтральным батанічным садзе 11 верасня

**У гэтым годзе магчымасцяў дакрануцца да свету навукі і тэхналогій стане больш — арганізатары мерапрыемства (Савет маладых вучоных НАН Беларусі) пашырылі геаграфічныя і часавыя рамкі навукова-папулярнага мерапрыемства, якое палюбілася і дзецям, і дарослым.**

Фактычна фестываль ужо стартаваў. Да суботы гасцей чакаюць на сваіх пляцоўках вышэйшыя навучальныя ўстановы (БДТУ, Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, БДМУ, БДПУ), школы робататэхнікі, інстытуты і лабараторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Можна будзе наведаць выстаўку мікраметэарытаў у Мінскім планетарыі, анатамічны музей у БДМУ, Музей гісторыі медыцыны, музей папулярнай навукі «Элемента», Археалагічны музей Інстытута гісторыі НАН, лабараторыі Інстытута генетыкі і цыталогіі, паслухаць лекцыю «Косці «кажуць», або Чым хварэлі нашы продкі» ў Інстытуце гісторыі, «Як мы спазнаём свет з дапамогай мовы» і «Лінгвістыка эмоцый» — у Лінгвістычным універсітэце, стаць удзельнікамі сямейнай квіз-гульні «Формула музыкі» ў Музеі музыкі, пагладзець у планетарыі навукова-папулярныя фільмы «У глыбіні Сусвету», «Зорка па імені Сонца», «Цёмная матэрыя», «Космікс» і іншыя. Таксама можна будзе далучыцца да панэльнай дыскусіі «Стварэнне лекаў: ад біта да таблеткі» ў Аб'яднаным інстытуце праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук. На ўсе гэтыя мерапрыемствы ідзе рэгістрацыя на сайце https://scifest.by.

Завяршальным акордам і цэнтральнай падзеяй фестывалю стане праграма, якая разгорнецца 11 верасня ў Цэнтральным батанічным садзе Нацыянальнай акадэміі навук.

Там будуць дзейнічаць адразу чатыры тэматычныя лекцыйныя пляцоўкі, назвы якіх інтрыгуюць. Так, на пляцоўцы «Экстрэмальная навука» можна будзе пачуць пра тое, дзе навука сустракаецца з небяспекай. У лекцыйнай зоне «Пакідаючы зямлю» размова пойдзе пра тэхналогіі, якія спатрэбяцца на іншых планетах, а медыцынская лабараторыя SYNLAB Belarus прадставіць лекцыйную пляцоўку «Жыць вечна», у праграме якой — лекцыі пра здароўе. Яшчэ адна лекцыйная пляцоўка будзе працаваць у фармаце бліц — кожная лекцыя доўжыцца 15 хвілін. За гэты час можна будзе даведацца пра энергетыку будучыні, 3D-біяпрынцінг, міфы пра генетычна мадыфікаваныя арганізмы і касмічную праграму Беларусі непасрэдна ад вучоных, занятых гэтымі даследаваннямі.

Насычаная праграма чакае дзяцей і падлеткаў. Свае майстар-класы прадставяць такія знакамітыя праекты, як «Разумны Мінск», StemLab, «Алгарытміка», «Малекула», «Элемента», «Эксперыментус». Гасцей фестывалю чакаюць актыўнасці па прыродазнаўчанавуковых дысцыплінах, праграмаванні і стварэнні альтэрнатыўных крыніц энергіі.

На выстаўцы найлепшых распрацовак вучоных НАН Беларусі госці фестывалю змогуць азнаёміцца з разнастайнымі экспанатамі: ад артэфактаў з раскопак акадэмічных гісторыкаў і рэдкіх насякомых энтамолагаў да беспілотнікаў і апошніх распрацовак у электратранспарце. Паспрабаваць самастойна правесці эксперымент можна будзе на пляцоўках майстар-класаў, якія будуць праводзіць мікрабіёлагі, сацыёлагі, батанікі, фізікі і генетыкі.

У Фестывалі навукі па традыцыі прымуць удзел і замежныя госці.

Уваход для дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту бясплатны. Больш падрабязна з праграмай Фестывалю навукі можна пазнаёміцца на сайце www.scifest.by.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Ірына РАМБАЛЬСКАЯ:

# «Бег — гэта эндарфінная залежнасць, ад якой вельмі цяжка адмовіцца!»



**Мінскі паўмарафон вяртаецца! У дзень горада, 12 верасня, чакаем яркі забег. Мінулы год для грандыёзнага спартыўнага свята стаў выключэннем: каранавірус унёс свае карэктывы. Сёлета паўмарафон пройдзе ў скарочаным фармаце: колькасць удзельнікаў абмежавана лічбай 10 тысяч чалавек. Ёсць і анлайн-фармат. Для бегуноў традыцыйныя на выбар тры дыстанцыі: 5,5, 10,5 і 21,1 кіламетра.**

**«Для аматараў бегу Мінскі паўмарафон — як глыток свежага паветра», — дзеліцца сваёй радасцю пастаянная ўдзельніца паўмарафону, тэлевядучая Ірына Рамбальская. Ірына, якая з Мінскім паўмарафонам з першага дня, расказала нам не толькі пра свой удзел у вялікім спартыўным свяце. Тэлевядучая акрэсліла ролю і месца бегу ў сваім жыцці, а таксама падзялілася, як за некалькі гадоў спартыўныя інтарэсы выйшлі далёка за межы прабежак і навошта трэба пачынаць бегаць усім і кожнаму.**

***— Ірына, з чаго пачалося ваша захапленне бегам?***

— Бегаю я з першага Мінскага паўмарафону, які адначасова стаў для мяне і штуршком, і адкрыццём, дзе я ў складзе каманды Dream Team спачатку пасрабавала прабегчы свой першы кіламетр, які, дарэчы, даўся мне вельмі цяжка. У дэбютным сезоне Мінскага паўмарафону я прабегла сваю першую пяцёрку — мінімальную дыстанцыю ў пяць з паловай кіламетра і далей па нарастаючай. На жаль, ковід спыніў усе нашы планы адносна ўдзелу ў забегах. За два апошнія гады ў мяне не атрымалася прыняць удзел дзесьці ў трох забегах. Таму вельмі цудоўна, што сёлета ў нас ёсць наш паўмарафон, на якім можна паказаць усе свае гадавыя навыкі. Ён хоць і пройдзе ва ўрэзаным фармаце, але вельмі крута, што яго захавалі. Гэта як глыток свежага паветра!

***— Напэўна, у вас ёсць персанальная статыстыка: геаграфія краін, дзе пашчасціла бегчы, і колькасць медалёў, якія вы атрымалі? Якія яны, вашыя асабістыя дасягненні?***

— Акрамя Беларусі, я бегала ў многіх іншых краінах: Польшча, Ізраіль, Украіна, Італія... Дзе была магчымасць, там і бегала. Колькасць медалёў дакладна не ведаю. Усё хачу набыць медальніцу. Пакуль жа захоўваю ўзнагароды ў верхняй шуфлядзе стала і бачу, што яны ўжо падпіраюць. Медаль, з аднаго боку, для мяне не галоўнае: няма дык няма. Але, з іншага боку, рэч для аматара вельмі прыемная, асабліва калі ў дзяцінстве ён быў вызвалены ад фізкультуры.

***— Дзіўная гісторыя: у дзяцінстве спорт быў забаронены, а цяпер вы актыўна ім займаецеся. Гэта спорт насуперак?***

— Спачатку быў насуперак, а цяпер, менавіта дзякуючы бегу я знаходжуся ў рэмісіі па такім сур'ёзным захворванні, як астма. Упэўнена, што і дыханне, і пашырэнне аб'ёму лёгкіх, якія трэніруюцца дзякуючы прабежкам, і тое цярпенне, якое неабходна для таго, каб бегчы не хвіліны, а гадзіны, — гэта ўсё працуе на карысць майму здароўю, нягледзячы на прагнозы дактароў. Лічу, што ў гэтым сэнсе бег для мяне — збаўчая рэч.



***— Якія эмоцыі вы адчуваеце і перажываеце падчас бегу?***

— Увогуле, бег — гэта наш натуральны стан, гэта тое, да чаго цела мае схільнасць. Паглядзіце на дзяцей: яны бегаюць і смяюцца. Гэта іх натуральны стан. Потым становяцца дарослымі і па нейкіх прычынах губляюць гэты навык. Вярнуць яго можна, але пры дапамозе трэніровак. І тут вельмі важна не гвалтаваць свой арганізм. У кожнага чалавека індывідуальныя хуткасць і тэмп. Трэба бегчы так, каб было камфортна. Чалавек павінен атрымліваць асалоду ад працэсу: тут ты спыніўся, каб сфатаграфаваць штосьці прыгожае, там качку пакарміў... Адна з галоўных кніг бегуна — «Бег 80:20». Дык вось асноўная думка гэтай кнігі такая: 80 працэнтаў часу ты павінен проста кайфаваць ад бегу, а ў астатнія 20 працэнтаў часу ты павінен пастарацца і перадолець сябе, як бы цяжка бегчы ні было.

***— Якім бегавым вынікам вы ганарыцеся больш за ўсё?***

— У нас быў дабрачынны марафон, які доўжыўся 24 гадзіны. Праходзіў ён у Мінску, на стадыёне ў раёне вуліцы Каліноўскага. У выніку я заняла 4-е месца, крыху не хапіла да трэцяга. Гэты марафон я лічу важным, таму што быў шматгадзінны забег. Пасля яго я задумалася над тым, каб паспрабаваць прабегчы ўльтрамарафон — той, што звыш 42 кіламетраў.

***— Давайце ўспомнім вядомы фільм «Форэст Гамп». Калі ў галоўнага героя спыталі: «Навошта вы бяжыце?», ён адказаў: «Я проста бягу». Ірына, навошта бежыце вы?***

— Ёсць у гэтым, перш за ўсё, падаплёка філасофская. Вось, напрыклад, калі ўзяць трыятлон. Чаму ён лічыцца відам спорту паспяховых людзей? Усё проста: кожны дзень яны вельмі інтэнсіўна працуюць і вымушаны факусіравацца на вырашэнні вялікай колькасці важных задач, што вядзе да перанапружвання, і, як вынік, зніжаецца хуткасць разумовых працэсаў. Дзеля таго каб прыняць правільнае рашэнне і скласці пазлы ў адзінае цэлае, чалавек павінен спачатку папрацаваць галавой, а потым адпусціць сітуацыю. Адпусціць яе проста так практычна немагчыма. Трэба расслабіць мозг. Калі ты бяжыш, твой мозг расслабляецца. У выніку ненадакучліва, як бы само сабою, ты атрымліваеш адказы на тыя пытанні, якія раней здаваліся вельмі цяжкімі. Яшчэ бег для мяне — гэта ўнікальная магчымасць слухаць аўдыякнігі. Атрымліваецца добрая эканомія часу! Акрамя гэтых момантаў, бег — абсалютна легальны спосаб атрымліваць задавальненне. На гэты конт ёсць нават медыцынскія даследаванні, якія даказваюць «эндарфінныя прыходы» падчас бегу. На пэўных кіламетрах ты адчуваеш, як табе становіцца добра. Ад такога задавальнення вельмі цяжка адмовіцца!

***— Звернемся да таго ж героя. Падчас бегу ў Форэста Гампа з'явілася шмат аднадумцаў. Наколькі я бачу ў вашых акаўнтах у сацсетках, вы таксама бегаеце не адна. Што даюць прабежкі з сяброўкамі?***

— Цяпер гэта наша нязменная чацвёрка бегуноў: я, Вікторыя Сянкевіч, Наталля Стэльмах і Ганна Ваўкавец. Сумесны бег — не толькі цудоўная магчымасць пагутарыць, вырашыць нейкія рабочыя пытанні. Разам з сяброўкамі мы ставім перад сабой і новыя спартыўныя мэты. Напрыклад, цяпер разам займаемся плаваннем. А наступнай вясной хацелася б узняцца на гару Арарат. Дарэчы, для любога ўзыходжання — Эльбрус, Арарат ці Эверэст — самай галоўнай асновай з'яўляецца бег. Ну, і, вядома, хацелася б адзначыць асяроддзе бегуноў у цэлым. Яно асабістае. Мы бачым адно аднаго здалёк, па красоўках. Гэта абсалютна бяспечнае асяроддзе людзей-аднадумцаў, якія, дзе б ты ні апынуўся, заўсёды падкажуць і пакажуць дарогу, а калі трэба, то і давязуць.

***— Вяртаючыся да Мінскага паўмарафону: калі чалавек бегае для асабістага задавальнення, ці дастаткова яму проста зарэгістравацца на забег? Альбо ўсё ж такі трэба пэўным чынам рыхтавацца?***

— Каб прабегчы максімальную дыстанцыю паўмарафону, на падрыхтоўку хопіць 3-4 месяцы. Паўгода — проста ідэальна, калі вы бегаеце 3-4 разы на тыдзень. Комплекс падрыхтоўкі абавязкова павінен уключаць расцяжку, планку. За тыдзень перад забегам інтэнсіўныя трэніроўкі неабходна спыніць і проста атрымліваць асалоду ад лёгкіх прабежак. Ну, а самы прыемны момант — гэта вечар напярэдадні забегу. Я маю на ўвазе вугляводную загрузку арганізма. Схадзіць у прыгожы рэстаран ці арганізаваць вячэру дома. Вугляводы — гэта тое, што бегуну проста неабходна. Яны даюць энергію.

***— Якую дыстанцыю на Мінскім паўмарафоне раіце выбраць, каб паспрабаваць свае сілы?***

**— Калі выдаляць «зубы мудрасці», то ўсе чатыры? Ці можна абмежавацца адным?**

— Нашы верхнія і ніжнія зубы з'яўляюцца антаганістамі — дзейнічаюць адначасова ў супрацьлеглых кірунках. Яны дапаўняюць адзін аднаго. Калі мы выдаляем ніжні зуб, то верхні страчвае апору і ссоўваецца. Гэта так званы феномен Папова-Гадона — зрушэнне зубоў у розных кірунках пасля ўтварэння дэфекту ў зубной дузе. Зуб, які пазбавіўся апоры, расхістваецца, ствараецца хранічная «кішэня», куды трапляюць рэшткі ежы. Таму калі выдаляецца ніжні зуб, то варта выдаляць і верхні. Як правіла, выдаляюць усе «васьмёркі», але робіцца гэта паэтапна, планава.

**— А ці магчыма адзін раз «адмучыцца» і выдаліць усе чатыры?**

— За адзін раз чатыры зубы, як правіла, амбулаторна не выдаляюць, бо гэта аперацыя часам дастаткова складаная і траўматычная. Лепш па адным у вольным рэжыме. Калі ёсць такая тэрміновая патрэба, то чатыры «васьмёркі» выдаляюцца ў стацыянары. Амбулаторна можна выдаліць адначасова два зубы — верхні і ніжні.

### НАСТУПСТВЫ І РЫЗЫКІ

**— З чаго пачынаецца аперацыя?**

— Калі пацыент прыходзіць на кансультацыю да стаматолага, першае, што ён мусіць зрабіць, — гэта здымак. Ён патрэбны, каб паглядзець форму каранёў, іх размяшчэнне. Падыходзяць два варыянты: панарамны здымак, гэта плоскасная выява, і 3D-здымак, гэта аб'ёмная выява, дзе відаць усе нюансы, у тым ліку як скрыўлены карані. Я аддаю перавагу 3D-здымкам, яны больш інфарматыўныя і дазваляюць лепш спрагназаваць вынік аперацыі.

У «васьмёрак» сустракаюцца і чатыры, і пяць каранёў. Часам карані зуба літаральна аплятаюць ніжнесківічны канал, тады «васьмёрку» лепш не чапаць, каб не пашкодзіць нерв, бо ёсць вялікая рызыка, што адчувальнасць часткі сківіцы знікне на ўсё жыццё. Тут толькі ўрач вырашае, ці ёсць сэнс выдаляць зуб.

**— Зубы мудрасці выдаляюць, як правіла, маладым пацыентам?**

— Узроставых абмежаванняў няма. Выдаляюць і ў 40-50 гадоў, калі яны не да канца прарэзаліся, пакрытыя слізістай, пад якую забіваецца ежа, і маецца хранічнае запаленне. Але маладыя пацыенты пераважаюць, бо яны цяпер больш увагі аддаюць правільнаму прыкусу.

**— Колькі цягнецца аперацыя і на што варта звярнуць увагу пасля яе?**

— У залежнасці ад складанасці зуба і шчыльнасці косці — ад 15 хвілін да 1,5 і нават дзвюх гадзін. У аднаго з маіх пацыентаў зуб прыйшлося выдаляць паўтары гадзіны: фрагментамі, распільваючы каронку і карані — настолькі шчыльная была косць. Чым глыбей размяшчаецца зуб і чым больш ён нахілены, тым складанейшая і даўжэйшая аперацыя.

Звычайна верхнія зубы паддаюцца лягчэй, хутчэй праходзіць і пасляаперацыйнае аднаўленне. Моцнай балючасці звычайна няма. Ніжнія ў гэтым плане больш складаныя. Пасля выдалення могуць быць ускладненае глытанне і жаванне, цяжка адкрыць рот, з'яўляюцца ацёк, павышаная тэмпература, але гэта звычайныя пасляаперацыйныя ўскладненні. Каб не далучылася бактэрыяльная інфекцыя, прызначаецца антыбіётык, а таксама абязбольвальныя прэпараты, спаданню ацёка садзейнічае прыкладанне «холаду».

Калі пасля аперацыі адчуваецца аняменне сківіцы, то не варта зацягваць, трэба звяртацца да ўрача, які зробіць дадатковыя прызначэнні — таблеткі, фізіяпрацэдуры. На раннім этапе аднавіць адчувальнасць куды прасцей.

Выдаленне варта планаваць загадзя і разумець, што могуць быць пасляаперацыйныя наступствы. Затым выключыць фізічныя нагрузкі, лазню і саўну. У момант абвастрэння запалення зуб лепш не выдаляць, бо горш бярэцца анестэзія, ёсць і іншыя нюансы. Таму спачатку лепш запаленне падлячыць.

**«Васьмёркі», ці «зубы мудрасці», як іх яшчэ называюць, з'яўляюцца пасля таго, як малочныя зубы ўжо цалкам замешчаны пастаяннымі, найчасцей у перыяд з 18 да 25-27 гадоў.**

Важны момант — гігіена. Пасля аперацыі таксама неабходна чысціць зубы. Некаторыя пацыенты баяцца гэта рабіць з-за швоў ці магчымага болю. Але гэта важны момант, каб не дадаць інфекцыі і паскорыць зажыўленне.

**— Ці праўда, што зубы мудрасці можна выдаліць яшчэ да таго, як яны выраслі?**

— Цяпер нярэдка выдаленне «васьмёрак» адбываецца ў падлеткавым узросце. Калі карані не сфарміраваныя канчаткова, можна выдаліць зачаткі. У такім выпадку зуб нашмат прасцей выходзіць. Гэта робіцца для папярэджання скучанасці і далейшага артадантычнага лячэння.


Фота з сайта 100med.ru

На слыху




# «СПАДАРОЖНІК» ЗАСЦЕРАГАЕ АД ЦЯЖКАЙ ФОРМЫ COVID-19

## Праведзена даследаванне расійскай вакцыны

**Даследаванне, у якім узяло ўдзел каля 14 тысяч чалавек, паказала, што дзве дозы расійскай вакцыны зніжаюць рызыку шпіталізацыі пасля заражэння штамам «дэльта» на 81 % і дапамагаюць пазбегнуць сур'ёзных пашкоджанняў лёгкіх, піша навуковы часопіс Science.**

У даследаванні была ацэнена эфектыўнасць вакцыны «Спадарожнік» у прадухіленні сімптаматычных выпадкаў хваробы сярэдняй і цяжкай ступеняў і, адпаведна, шпіталізацыі. Улічваючы тое, што на момант даследавання ў Расіі дамінуючым штамам была «дэльта», то, фактычна, дадзенае даследаванне дэманструе эфектыўнасць «Спадарожніка» ў дачыненні да «дэльты».

Быў праведзены аналіз даных пацыентаў двух буйных дыягнастычных цэнтраў Санкт-Пецярбурга, якія ў разгар пандэміі сталі працаваць як фільтры, зніжаючы нагрузку на прыёмныя аддзяленні бальніц горада.

Службы хуткай медыцынскай дапамогі прывозілі ў гэтыя цэнтры пацыентаў са станоўчым ПЛР на COVID-19, у дыягнастычных цэнтрах пацыентам рабілася нізкадозавая КТ, правяралася сатурацыя, вёўся ўлік сімптомаў, удакладняўся прышчэпачны статус. Па выніках комплекснага абследавання прымалася рашэнне ці аб шпіталізацыі пацыента, ці аб накіраванні яго на самаізаляцыю і дамашняе лячэнне.

У рабоце, такім чынам, прааналізаваны даныя практычна 14 тысяч чалавек, якія звярталіся ў цэнтры ў тэрмін з 3 ліпеня да 9 жніўня 2021 года.

Сярод тых, каму спатрэбілася стацыянарнае лячэнне (495 з 13 894 чалавек), прышчэпленых «Спадарожнікам» было ўсяго 17, гэта значыць 3,4 %. 96,6 % са шпіталізаваных (а гэта значыць, з каранавірусам у сярэднецяжкай і цяжкай формах) былі непрышчэпленыя або часткова прышчэпленыя.

Што датычыцца цяжкасці пашкоджання лёгкіх, даследчыкі адзначаюць, што ў групе прышчэпленых ні ў кога не было рэнтгеналагічнай карціны, якая адпавядае КТ-3 і больш (КТ-3 адпавядае 50-75 % паражэння лёгкіх, КТ-4 — больш за 75 %).

Сатурацыя (насычэнне крыві кіслародам) у групы прышчэпленых была таксама вышэйшая, чым у непрышчэпленых.

Таксама была адзначана ўзроставая карэляцыя: павелічэнне імавернасці шпіталізацыі з павелічэннем узросту для непрышчэпленых (яна ўзрастае ва ўзроставай групе пасля 60 гадоў), у той час як у вакцынаванай групе такой залежнасці ад узросту адзначана не было.

Выніковая эфектыўнасць «Спадарожніка» супраць цяжкага сімптаматычнага захворвання і шпіталізацыі склала 81 %, што даволі нядрэнна, хоць і ніжэй за эфектыўнасць Pfizer / BioNTech, якая знаходзіцца на ўзроўні 96 %.

Таксама аўтары робяць выснову пра тое, што чым больш часу прайшло ад другой дозы «Спадарожніка», тым вышэйшая была засцярога (меншыя ступень пашкоджання лёгкіх і колькасць сімптомаў, больш лёгкая ступень цяжкасці хваробы або зусім бессімптомная). Аднак гэтых звестак пакуль недастаткова, каб зрабіць выснову пра тое, калі варта рэвакцынавацца бустарнай дозай і ці варта наогул. Даследаванні ў гэтым кірунку будуць працягвацца.

# ЖЫВЫЯ ЛЮДЗІ, А НЕ СХЕМЫ

## Калі героі вайны становяцца запамінальнымі літаратурнымі персанажамі

Так, ваенная тэматыка дужа актуальная для беларускай літаратуры... І ў ёй шмат персанажаў, прататыпамі былі рэальныя героі вайны.

Але адна справа — дакументальныя творы накшталт «Мы — з вогненнай вёскі» ці белетрызаваныя біяграфіі... Іншая рэч — мастацкі тэкст, дзе аўтар хоча быць вольным у сваіх задумах. А як спалучыць палёт фантазіі з фактамі, якія баішся змяняць нават у драбніцах? Аднойчы вядомы драматург Аляксей Дудараў абмовіўся: «Я, напэўна б, узяўся напісаць пра Заслонава, але толькі ў тым выпадку, калі мяне з усіх бакоў не будуць акружаць «узброеныя» гісторыкі, для якіх кожная коска — гэта святыня, якая павінна вісець у рамцы. А мастацкі падыход — гэта не рамка». Нават Мележа часта папракалі ў тым, што ў яго рамане «Мінскі напрамак» партызанскія камандзіры выпісаны ідэалізавана-схематычна... Нездарма пісьменнікі вядомых гістарычных асоб часцей рабілі другараднымі персанажамі, а галоўнымі — выдуманых: Сотнікава, Ганну Чарнушку. Але ўсё ж такі ёсць творы, дзе алхімія мастацтва адбылася, і рэальная персона зажыла на старонках па законах мастацтва... Давайце ўспомнім некаторыя такія творы.

### Якуб Колас «Дрыгва»: Дзед Талаш

*«Выпрастае прыгнутую гадамі спіну, зірне па-арлінаму: — Го! Я сеў бы на каня і паказаў бы яшчэ, чаго варты стары Талаш!»*

Пачнём з найстарэйшага ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны — легендарнага дзеда Талаша. Праславіўся Васіль Ісакавіч Талаш дзякуючы сваім подзвігам у вайне супраць белапалякаў і Якубу Коласу, які ў 1934 годзе надрукаваў аповесць «Дрыгва». Час быў нялёгкі, на Коласа абрынулася вульгарызатарская крытыка... А тэма савецка-польскай вайны была якраз актуальнай. Аповесць адразу набыла папулярнасць, перакладалася, перавыдавалася — і не з-за актуальнасці, а ўсім палюбіўся жыццялюбны, адважны герой, які ў свае восемдзесят з гакам узначальвае партызанскі атрад. Колас нават пісаў у вершы пра сваё бядотнае змаганне з цэнзурай:

*Нічагусенькі няма на «Рубяжы»,*
*«Казкі жыцця» мае леглі пад нажы,*
*Глушыць ніву маю дзікая трава,*
*Засталася ад мяне адна «Дрыгва».*

Цікава, што Колас працаваў над аповесцю, не бачыўшы свайго героя ўжывую. *«Упершыню сустрэўся з героем сваёй аповесці ў Мінску, у будынку Акадэміі навук. Гэта было ў 1934 годзе, пасля таго як аповесць была выдадзена. Дзед Талаш прачытаў яе і вырашыў убачыць мяне. Мы гаварылі з ім пра аповесць. Дзед крыху крытыкаваў мае пралікі. Так, напрыклад, у аповесці дзед названы Рыгорам. На самай жа справе яго завуць Васілём (Ісакавічам). Я пераблытаў і імёны яго сыноў. Ён таксама не быў згодзен са мной і ў тым, што ён збег ад трох канваіраваўшых яго польскіх салдат. Дзед упарта стаіць на тым, што іх было пяць...»*

Ужо з гэтага ўрыўка вы разумееце, наколькі Колас адгадаў характар свайго героя. Дзед Талаш быў упарты, харызматычны і з неардынарным пачуццём гумару. Дарэчы, так і застаўся аднаасобнікам, не пайшоў у калгас. Ад Якуба Коласа патрабавалі частку ганарару ад «Дрыгвы», бо лічылі, што мае на гэта права. Дый увогуле пра яго шмат баек і анекдотаў засталося...


Я. Колас і дзед Талаш.

Калі пачалася вайна, імя дзеда Талаша стала сімвалам народнага змагання. У жніўні 1941 года паэт Аляксей Суркоў надрукаваў у газеце «Известия» верш «Дзед Талаш» пра беларускіх партызан. Зразумела, што героя не маглі не завабіць у партызаны, хоць было яму 98 гадоў. У 1943-м жывы сімвал пераправілі ў Маскву. Захаваўся здымак, на якім Талаш і Колас сядзяць у гатэлі «Масква» і п'юць гарбату. «Я гляджу на яго сялянскі воблік, і мне з ім весялей», — сцвярджаў пісьменнік. Магутны дзед дажыў да 103 гадоў. А ў якасці літаратурнага вобраза працвітае і па сёння.

### Аркадзь Куляшоў «Балада аб чатырох заложніках»: Мінай Шмыроў

*Іх вядуць па жытняй сцяжынцы.*
*Чатырох.*
*Пад канвоем.*
*З дому.*
*Чатырнаццаць —*
*старэйшай дзяўчынцы,*
*Тры гады хлапчуку малому.*

Яшчэ са школы запамінаюцца кранальныя радкі балады Аркадзя Куляшова... У аснову яе пакладзены рэальны факт. Фашысты ўзялі ў заложнікі дзяцей партызанскага камандзіра, бацькі Міная. Камандзір не мог пайсці на тое, каб здацца, нягледзячы на душэўныя пакуты. Заложнікаў расстралялі.

*Стрэл.*
*Упаў хлапчук трохгадовы...*
*Кат ізноў пісталет узнімае...*
*На сцяне — заложнікаў цені...*
*Вось і ўсё.*
*Перад бацькам Мінаем*
*Станьце, ўсе бацькі, на калені!*

Паэму Аркадзь Куляшоў напісаў у чэрвені 1942 года. Бацька Мінай, ён жа Мінай Піліпавіч Шмыроў, сапраўды легендарная асоба. Незадоўга да вайны ўзначальваў кардонную фабрыку, тады памерла яго жонка, пакінуўшы чацвёра дзяцей, малодшаму было 2, старэйшай — 13 гадоў. Мінай Піліпавіч, пачаўшы партызаніць, дваіх дзетак адправіў жыць да маці, дваіх — да цешчы... Потым хацеў забраць іх да сябе ў атрад, але бабулі не аддалі ўнукаў.

Заложнікаў трымалі ў Суражы, чакаючы, калі партызанскі камандзір здасца ці ад роспачы пачне рызыкоўныя дзеянні. *«Што я тады думаў? Дзеткі мае дарагія, родныя мае. Ну як вам перадаць, як паведаць пра боль мой? А што рабіць, што прыдумаць? У бой ірвуцца мае хлопцы, гатовыя галовы за вас пакласці. Але як весці мне іх на танкі, на дзоты, пад нямецкія гарматы? Пераб'юць...»* Старэйшая дачка Ліза перадала бацьку Мінаю цыдулку: *«Тата, за нас не хвалюйся, нікога не слухай, да немцаў не ідзі. Калі цябе заб'юць, то мы бездапаможныя і за цябе не адпомсцім. А калі нас заб'юць, тата, то ты за нас адпомсціш».*

Мінай прайшоў вайну... З'явілася ў яго іншая сям'я. Але, як сведчылі родныя, яго падушка штоноч была мокрай ад слёз. «Балада аб чатырох заложніках» узрушвае дасюль, чытач яскрава ўяўляе, што перажывае бацька забітых дзяцей.

Цікава, што ў рамане Лынькова «Векапомныя дні» бацька Мінай выведзены пад іменем бацькі Мірона. Аўтар пазбаўляе героя пакут выбару: яму проста паведамляюць, што яго дзеці расстраляныя.

### Алесь Адамовіч «Вайна пад стрэхамі», «Сыны ідуць у бой»: Ганна Адамовіч

*«Выявілася, што я нават уласную маці па-сапраўднаму не ведаў. Любіў — і толькі. А як чалавека пабачыў і зразумеў, калі пачалося жахлівае жыццё».*

Так пісаў Алесь Адамовіч пра сваю маці, Ганну Мітрафанаўну Адамовіч. Менавіта яна стала галоўнай гераіняй у партызанскай дылогіі «Вайна пад стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой». Аўтар назваў яе Ганнай Корзун, запазычыўшы прозвішча ў цёткі. *«Калі мне што і ўдалося ў рамане, дык гэта таму, што раней гэтую кнігу маці напісала ўласным жыццём».*

Ганна Мітрафанаўна загадвала аптэкай у пасёлку Глуша. Муж пайшоў на фронт, а яна пачала дапамагаць партызанам і падпольшчыкам. Калі ўзнікла пагроза арышту, разам з дзецьмі сышла ў лес. Тое, што адбывалася з літаратурнай гераіняй Ганнай Корзун, можна параўнаць з успамінамі Ганны Адамовіч «І так было кожны дзень», якія друкаваліся ў часопісе «Нёман» у 1999 годзе.

У экранізацыі Віктара Турава 1967 года ролю Ганны Корзун сыграла Ніна Ургант. У аўтабіяграфічнай кнізе «Vixi» Адамовіч прыводзіць такі партрэт сваёй маці: *«Дзве тоўстыя касы, што па-вясковаму звісаюць спераду, выразны абрыс вуснаў, носа, які робіць твар капрызна-ўпартым. Такая вясковая красуня зусім верагодна, што магла не стрымаць абурэння, плюнуць у твар польскому «жалнежу», калі ён па-салдацку груба схапіў яе за руку. Яна гэтак і зрабіла, наша магчымая мама, а потым суткі хавалася ў жыце, а яе шукалі раз'ятраныя палякі».*

Бацькі Ганны былі раскулачаныя, высланыя ў Якуцію, і Ганна Адамовіч ратавала рэпрэсаваных свакоў, «як з агню выхоплівала». Гэта ад маці пісьменнік успадчыніў гуманізм і адвагу. *«Кожную смерць, кожнае раненне я аплакавала ў душы як маці. Увогуле ж ніхто не бачыў маіх слёз, ні мае дзеці, ні дзеці другіх маці. Я заўсёды прысутнічала на пастраеннях і пры адыходзе на баявыя аперацыі аддавала ўсім аднолькавую ўвагу, не вылучаючы сваіх дзяцей, — дабраслаўляла ўсіх».*

Вобраз Ганны Корзун атрымаўся запамінальны і яркі, для аўтара раманаў ён увасабляў беларускі характар. *«Можаш на людзей крыўдзіцца, але не на радзіму».* Зрэшты, Адамовіч і змагаўся супраць няшчырай, пафаснай літаратуры пра вайну, за тое, каб паказваць падзеі праўдзіва, а герояў — жывымі...

*«Вядома, рэальныя партызаны аказаліся зусім не такімі, якімі мне тады ўяўляліся. Горшымі? Не. Лепшымі? Не. Аказаліся жывымі людзьмі, а жывых адным словам не вызначыш. Калі да таго я адкрываў для сябе іншых людзей, дык тут, у партызанах, адкрыў самога сябе, бо страх смерці прасвечвае чалавека да дна — глядзі, які ты, і, калі можаш, старайся рабіцца трохі лепшым».*

### Іван Шамякін «Сэрца на далоні»: Яўген Клумаў

Яшчэ адзін яркі вобраз героя вайны стварыў пісьменнік-франтавік Іван Шамякін у рамане «Сэрца на далоні». Доктар Савіч, які ўзначальваў падполле, быў забіты акупантамі, але пасля абвешчаны здраднікам. Самае страшнае — некаторыя з тых, хто ведаў праўду, не хочуць пра яе распавядаць, каб не «замазацца» ды не дзяліцца славай змагароў. Доктар Яраш, былы студэнт Савіча, вырашае абяліць імя былога настаўніка. *«Я ведаў не Савіча-здрадніка, а Савіча-лекара, буйнейшага інфекцыяніста, бясстрашнага чалавека, які за сорак год лекарскай дзейнасці патушыў дзясяткі эпідэмій. Яго паважалі ў горадзе. Няўжо такі чалавек мог прадацца?».*


Яўген Клумаў з жонкай.

Прататыпам Савіча стаў доктар Яўген Клумаў. Ён быў са старой дарэвалюцыйнай інтэлігенцыі, жанаты на пляменніцы пісьменніка Караленкі. Калі працаваў на Лоеўшчыне, было гэта ў 1913-м, давялося ратаваць жыццё студэнту, які з-за нешчаслівага кахання спрабаваў скончыць жыццё самагубствам. Падчас аперацыі Клумаў трымаў у руках жывое сэрца студэнта. Пацыент застаўся жыць, а мясцовыя жыхары запомнілі выпадак. Шамякін бываў на Лоеўшчыне, чуў ад мясцовых пра цуд-доктара... Вось вам і вобраз «сэрца на далоні».

Пасля рэвалюцыі Клумаў стаў прафесарам, працаваў у мінскай бальніцы. Калі пачалася вайна, яму было за шэсцьдзесят. Мянушка доктара ў падполлі — таварыш Самарын. Восенню 1943-га Клумаў з жонкай былі схопленыя гестапаўцамі. Доктар адмовіўся супрацоўнічаць з акупантамі. У лютым 1944-га ён з жонкай загінуў у аўтамабілі-душагубцы па дарозе ў лагер Малы Трасцянец. У 1965-м Яўгену Клумаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У рамане, які Шамякін пісаў у час адлігі, адлюстравана складаная сітуацыя з высвятленнем гістарычнай праўды пра мінскае падполле. Усіх, хто апынуўся на акупаванай тэрыторыі, лічылі здраднікамі, прызнаваць факты, якія разбуралі ўхваленыя стэрэатыпы, адны баяліся, другія не хацелі... Імёны сапраўдных герояў нярэдка даводзілася даставаць з небыцця, ачышчаць ад бруду.

### Пятрусь Броўка «Голас сэрца»: Алена Сцяпанаўна Броўка

*Зніклі вы ўсе ў непраглядныя ночы...*
*Помню, хадзіў я увосень аднойчы,*
*Поўнымі гора, пакуты вачыма*
*Клікаў цябе між дратоў Асвянцыма.*

Яшчэ адзін пранізлівы вобраз, вобраз маці — цэнтральны ў паэме Петруся Броўкі «Голас сэрца». У народнага паэта шмат напісана пра вайну, напрыклад, «Паэма пра Смалячкова», вядомага снайпера родам з Беларусі. «Прайдзіся ж ты, сціплая песня, па мужных слядах Смалячкова, па снайперскіх тайных засадах, па плошчах і шумных палях»... Але паэма «Голас сэрца» вылучаецца шчырым, непрыхаваным болем... Ёсць нават радкі:

*Знаю, ў жалезе былі твае рукі —*
*І гэта, і гэта не ўсе яшчэ мукі...*
*Хай бы лепш сэрца не чула,*
*не знала,*
*Што мне адна паланянка сказала.*

Любячы сын не змог нават у мастацкім творы агучыць усё тое, што даведаўся... З пачаткам вайны паэт адправіўся ў эвакуацыю, удзельнічаў у антыфашысцкай прэсе. Яго маці, Алена Сцяпанаўна, засталася ў вёсцы Пуцілкавічы, дапамагала партызанам. Яе арыштавалі. Пасля пакутлівага падарожжа па вязніцах трапіла ў Асвенцым. Жанчын змушалі цягаць вялізныя камяні, закопваць... Пасля адкопваць — і зноў цягаць на іншае месца. Аднойчы фашысты вырашылі скараціць колькасць вязняў — выстраілі ўсіх, і кожнага дзясятага адпраўлялі ў газавую камеру. Каля Алены Сцяпанаўны стаяла чатырнаццацігадовая дзяўчынка Ніна Подгал. Дзясяты лік выпаў на Ніну... Маці паэта абняла дзяўчынку і паставіла на сваё, дзявятае, месца. А сама адправілася на смерць... Ніна Подгал выжыла, менавіта яна і распавяла ўсё Петрусю Броўку.

Шкада, што гэтая гісторыя не прагучала падрабязна ў паэме, куды аўтар дадаў разважанняў на патрэбу дня... Але найлепшыя фрагменты твора гучаць па-ранейшаму кранальна.

*Досыць мне ростані, родная,*
*досыць.*
*Што ты загінула, — можа,*
*здалося...*
*Лягу з дарогі, а ты пры мне сядзеш,*
*Сядзеш, маю галаву ты пагладзіш,*
*Скажаш: — Які ж ты,*
*які ж ты сівенькі...—*
*А я прыгадаю, як быў шчэ*
*маленькім...*

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# «ПА-ПЕРШАЕ, Я З ПІНСКА...»

**Не так шмат у Беларусі гарадоў, па якіх турыстаў можна вадзіць больш за тры гадзіны і пры гэтым не паспець распавесці нават пра палову мясцовых цікавінак. Тут захавалася багата гістарычных аб'ектаў, і мясцовыя жыхары ўпэўненыя, што калі б у Брэсце не было крэпасці, Пінск мог бы стаць добрым канкурэнтам абласному цэнтру. І хоць пакуль сюды рэдка заязджаюць вялікія аўтобусы з экскурсійнымі групамі, у сталіцы Палесся (менавіта пад такім слоганам можа рэкламавацца горад) ёсць усе шанцы стаць запатрабаваным турыстычным цэнтрам, што і пацвердзіў выязны семінар, праведзены Нацыянальным агенцтвам па турызме сумесна з Брэсцкім выканкамам.**



## ГІСТОРЫЯ — ЗА КОЖНЫМ ДОМІКАМ

Першая згадка Пінска — 1097 год, хоць, як мяркуюць даследчыкі, горад існаваў ужо ў VIII стагоддзі, праўда, знаходзіўся ў іншым месцы.Такая працяглая гісторыя, а можа, заможнасць горада — усё ж тут сыходзіліся рэкі, праз якія былі пракладзены гандлёвыя шляхі, што звязвалі Балтыку з Чорным морам, — паўплывалі на характар мясцовых жыхароў. Надта яны ганарыліся сваім паходжаннем, і калі бывалі ў чужых краях, усяляк яго падкрэслівалі. На такую асаблівасць пінчукоў звярталі ўвагу пісьменнікі, этнографы, падарожнікі. Дзякуючы гэтаму з'явілася ідэя для новай гарадской скульптуры — на вуліцы «пасяліўся» знакаміты Пінчук, які важна загінае пальцы і заяўляе: «Па-першае, я з Пінска...». Бронзавая скульптура запрашае на «шпацыр па Газе» — так мясцовыя жыхары празвалі прагулкі па галоўнай гарадской вуліцы. «Газа» перакладалася як «Вялікая». За рознымі часамі вуліца мяняла назвы: Вялікая Спаская, Вялікая Францысканская, Вялікая Кіеўская, Тадэвуша Касцюшкі, а пры Саветах перайменавана ў вуліцу Леніна. Сёння яна стала пешаходнай, абзавялася арыгінальнымі лавачкамі і ліхтарамі. Бліжэй да вечара і ў выхадныя ды святочныя дні тут з'яўляюцца рамеснікі, вуліца напаўняецца жыхарамі і гасцямі горада, якія павольна прагульваюцца па дарозе, выкладзенай каменнем, альбо разглядваюць рэшткі знакамітай шасціграннай пліткі-трылінкі (ці, як яе яшчэ называюць, «пінскай косткі»). У 30-я гады мінулага стагоддзя інжынер Уладзіслаў Трылінскі прапанаваў замест камянёў выкладваць вуліцы такімі пліткамі, зробленымі з колатага базальтавага каменю, залітага бетонам. І пазней гэтай пліткай брукаваліся вуліцы і плошчы палескіх гарадоў, а таксама дарога, што вяла да Брэста.

Ці не за кожным домікам «пінскай пешаходкі» стаіць гісторыя. Раней тут былі дзясяткі рэстаранаў, магазінаў, гасцініц. Так, побач са скульптурай Пінчука размяшчаецца будынак былой гасцініцы «Англійская», якая ў міжваенныя гады ўражвала сваіх гасцей багатым убраннем, кожны нумар быў тэлефанізаваны, у мясцовым рэстаране не сціхала музыка і працавалі танцоўшчыцы. Тут спыняліся самыя важныя госці, у тым ліку і амерыканская падарожніца Луіза Арнэр Бойд, якая за даследаванні Арктыкі і Грэнландыі атрымала мянушкі «Лэдзі Арктыкі» і «Каралева лёду». Падчас сімпозіуму географаў у Варшаве жанчына пацікавілася, які наступны куток варты яе даследавання, і пасля, у 1934 годзе, наведала Піншчыну. Луіза зрабіла сотні здымкаў, напісала кнігу, у якой дзялілася сваім захапленнем тутэйшай мясцовасцю і ладам жыцця палешукоў, якія жывуць сярод балот. Здзіўлялася, як мясцовыя жыхары арыентуюцца ў зарасніку чароту і знаходзяць дарогу дадому. Нават прымаўка хадзіла, што хутчэй рыба патоне, чым паляшук. Не дзіва, што падарожніца параўнала палешукоў з індзейцамі возера Ціцікака і афрыканскімі плямёнамі вярхоўя Ніла...

Падчас падарожжа па «пінскай пешаходцы» даведацца, як раней выглядала галоўная вуліца, дапаможа вялікае графіці мастака Яўгена Сасюры.

## АБЛОКІ, ПАДОБНЫЯ НА БАЛОТЫ

У Пінску было шэсць каталіцкіх манастыроў, ад некаторых засталіся фрагменты ці наогул захаваліся толькі назвы. Усяго адзін ансамбль


Графіці на пешаходнай вуліцы.

дайшоў да нашага часу — манастыра францысканцаў. Вяршыня ансамбля — кафедральны касцёл Узнясення Найсвяцейшай Дзевы Марыі. Гэта адна з трох малых базілік у Беларусі (побач з Будслаўскім касцёлам і касцёлам Святога Ксаверыя ў Гродне). Такі статус надаецца толькі найбольш прыгожым, з багатай гісторыяй храмам. Сапраўды, мала проста палюбавацца шыкоўным барочным фасадам — уражвае і багаты інтэр'ер з далікатнай драўлянай разьбой, пакрытай пазалотай. Сярод палотнаў вы ўбачыце «Пінскую мадонну» Альфрэда Рэмера, якая стаіць на аблоках, падобных на пінскія балоты. І нават сцэна «Пакланенне вешчуноў» падчас размалёўвання касцёла набыла тут свае рысы — замест класічных біблейскіх пастухоў пакланіцца Ісусу прыйшлі жыхары мясцовых ваколіц: стары паляшук у лапцях з торбай, юны пастушок з дудачкай, шляхціч з гасцінцамі ў кошыку і кабета ў палескім строі.

А яшчэ тут можна пачуць і ўбачыць адзін з самых вялікіх гістарычных арганаў Беларусі (ён мае 1498 труб!). Але для ўдзельнікаў семінара, на якім прэзентаваўся новы турыстычны маршрут Брэстчыны, на гэтым адкрыцці не спыніліся — дзякуючы старшыні Пінскага аддзялення Беларускага грамадскага аб'яднання экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў Тацццяне Хвагінай, удалося пабываць у сценах семінарыі і на ўласныя вочы ўбачыць фрэскі пачатку XVIII стагоддзя.

Больш за сто гадоў будынку Палескага драматычнага тэатра. Як паведаміў яго дырэктар Аляксандр Мікалаевіч Лукашэнка, калектыву, які сёння ставіць тут спектаклі для дзяцей і дарослых, сёлета споўнілася 15 гадоў. Адна з візітовак тэатра — «Пінская шляхта». Дворык побач з будынкам упрыгожаны драўлянымі фігурамі — героямі з гэтага спектакля і цытатамі кожнага з персанажаў.

Нават навучальныя ўстановы тут размяшчаюцца ў стагадовых будынках. Як напрыклад, Пінскі каледж мастацтваў. Штогод яго навучэнцы свае выпускныя балі пад паланэз Агінскага і іншую старадаўнюю музыку на радасць гараджанам ладзяць проста на вуліцы.

Таксама на слыху найстарэйшая гімназія Палесся (пабудавана ў 1853 годзе), многія выпускнікі якой сталі вядомымі ва ўсім свеце. Захаваліся будынкі, звязаныя з ваеннай гісторыяй, напрыклад, месца, дзе быў арганізаваны першы палескі партызанскі атрад (уже 26 чэрвеня 1941 года).

Палац Бутрымовіча, вядомы, як «Пінскі мур», стаў першай некуль-

**У пасляваенны час, ведаючы, колькі каштоўнасцяў адсюль было вывезена за межы краіны, супрацоўнік музея Баравікоў едзе да міністра культуры Фурцавай і пераконвае аддаць з запаснікаў музеяў Расіі карціны для адкрыцця галерэі ў Пінску.**

тавай камяніцай горада. Ён стаіць на палях, бо быў узведзены ў тым месцы, якое часта размывала вада. Пасля — чвэрць стагоддзя забыцця і запусцення, сёння ён адрамантаваны і тут рэгіструюцца шлюбы. Першы ўладальнік палаца — Матэуш Бутрымовіч, падстараста пінскі, палітычны дзеяч, адыграў важную ролю ў развіцці свайго краю, дзякуючы яму пачалося будаўніцтва такіх водных шляхоў, як Каралеўскі канал і канал Агінскага. Калі будоўля канала ў была завершана, Матэуш купіў 10 караблёў, нагрузіў іх таварамі і выправіў у Польшчу. Як пісалі тагачасныя газеты, тады ўся Варшава збеглася паглядзець на «палескіх індзейцаў»...

## ВАРТА ЗАТРЫМАЦЦА

Натуральна, пагулянкі па Пінску не абмяжоўваюцца адной пешаходнай вуліцай. Як паведаміў **намеснік старшыні гарадскога выканаўчага камітэта Пінска Генадзь ПАЛІКОЎСКІ,** горад мае добры турыстычны патэнцыял, за апошнія пяць гадоў было зроблена вельмі многае, і да пандэміі, у 2019 годзе, экспарт турпаслуг перавараліў за мільён 260 тысяч.

У планах стварыць тут цэлы пешаходны квартал, прадумаць веласіпедныя маршруты. Паспяхова развіваецца водны турызм — у летні час гісторыю горада можна спасцігаць падчас цеплаходных экскурсій. А чаму б не прагуляцца па старажытным прадмесці Каралін, якое сёння ўваходзіць у склад горада, а раней спрабавала канкурыраваць з ім і было вельмі заможнае. Сто гадоў таму тут гулялі юныя Хаім Вейцман і Голда Меір (будучыя прэзідэнт і прэм'ер-міністр Ізраіля). Наогул, у горадзе можна ладзіць асобную экскурсію, прысвечаную яўрэйскай спадчыне. Ствараецца тут і новы музей пры яўрэйскай школе.

У Пінску знаходзіцца храм, дзе вянчаўся Якуб Колас, а ў Музеі Беларускага Палесся захоўваецца кушэтка, на якой сядзеў класік. Увогуле, сярод экспанатаў музея шмат цікавых артэфактаў: Тураўскі саркафаг з ружовага сланцу XII стагоддзя, Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 года, драўляны ровар, сцяг, зроблены ў гады Вялікай Айчыннай вайны з рызы святара, які пайшоў у партызаны. А самы вялікі экспанат — адзін з першых савецкіх трактароў, які ўзворваў палескія землі, размясціўся на вуліцы перад уваходам у музей. А яшчэ пры музеі дзейнічае карцінная галерэя. Не здзіўляйцеся, калі ўбачыце тут скарбы, прывезеныя з запаснікаў Траццякоўскай галерэі і Рускага музея, — карціны Айвазоўскага, Шышкіна, Makoўскага. У пасляваенны час, ведаючы, колькі каштоўнасцяў адсюль было вывезена за межы краіны, супрацоўнік музея Баравікоў едзе да міністра культуры Фурцавай і пераконвае аддаць з запаснікаў музеяў Расіі карціны для адкрыцця галерэі ў Пінску.

**Такая працяглая гісторыя, а можа, заможнасць горада — усё ж тут сыходзіліся рэкі, праз якія былі пракладзены гандлёвыя шляхі, што звязвалі Балтыку з Чорным морам, — паўплывалі на харатар мясцовых жыхароў.**

А знаходзіцца музей у будынку калегіума — найстарэйшага архітэктурнага помніка ў Пінску. Раней калегіум уваходзіў у ансамбль іезуіцкага манастыра, пабудаванага ў XVII стагоддзі. Доўгі час галоўная складальная комплексу — шыкоўны касцёл Святога Станіслава — быў адным з самых вялікіх будынкаў ВКЛ (па вышыні — як сучасныя 9-павярховікі). На яго вежу ў 1706 годзе падымаўся шведскі кароль Карл XII. Пасля Вялікай Айчыннай архітэктурны шэдэўр быў зруйнаваны, а ў 1953 годзе будынак узарвалі, бо для тагачаснай улады ён «не меў мастацкай і гістарычнай каштоўнасці».

Пінская плошча здзіўляе сваімі кантрастамі. Побач са старым калегіумам захаваўся помнік Леніну, каля якога час ад часу шпацыруюць буслы. Так, Пінск — месца, дзе ахвотна селяцца гэтыя птушкі. Адна з буслянак размешчана на трубе ад кацельні старой лазні, у якую за савецкім часам перарабілі яўрэйскую мікву...

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**



Запрашальнік

# «ВЕДАЮ БЕЛАРУСЬ»

**Рэспубліканскі праект пад такой назвай у Год народнага адзінства рэалізоўвае БРСМ. Ён будзе ўключаць у сябе серыю анлайн-квізаў «Ведаю Беларусь», адкрыты чэмпіянат сярод байцоў студэнцкіх атрадаў па хуткаснай зборцы спілс-карт краіны, рэспубліканскі чэмпіянат «Ведаю Беларусь» па хуткаснай зборцы спілс-карт, турнір па зборы пазлаў «Ведаю Беларусь».**



Фота БелТА.

Спілс-карта Рэспублікі Беларусь — вучэбна-гульнявы дапаможнік па вывучэнні адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання краіны, які ўяўляе сабой камплект магнітных гульнявых элементаў, што маюць візуальную форму геаграфічных граніц раёнаў. Назва «спілс» — вытворнае ад прозвішча Джона Спілсберы, вынаходніка пазлаў — прававобраза спілс-карт.

Серыя анлайн-квізаў «Ведаю Беларусь» арганізоўваецца шляхам інфармацыйна-камунікацыйных сродкаў на анлайн-платформе onlinetestpad.com і мае на ўвазе інтэлектуальныя спаборніцтвы па пытаннях гісторыі, геаграфіі, культуры краіны. Правядзенне квізаў запланавана на 10, 16 і 20 верасня. Пераможца квізу (першае месца) вызначаецца ў кожным з квізаў па найбольшай колькасці правільных адказаў.

Адкрыты чэмпіянат сярод байцоў студэнцкіх атрадаў па хуткаснай зборцы спілс-карт Рэспублікі Беларусь адбудзецца ў Мінску 16 верасня. У ім прымаюць удзел каманды з ліку байцоў студэнцкіх атрадаў. Каманда складаецца з трох чалавек.

Рэспубліканскі чэмпіянат «Ведаю Беларусь» па хуткаснай зборцы спілс-карт уключае ў сябе абласныя (Мінскі гарадскі) туры і рэспубліканскі фінал. Прыняць удзел у ім могуць малады люда, грамадзяне Рэспублікі Беларусь, ва ўзросце ад 14 да 31 года ў наступных катэгорыях: каманды навучэнцаў агульных сярэдніх навучальных устаноў, каманды навучэнцаў сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў адукацыі, каманды студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, каманды працоўнай моладзі. Ва ўсіх выпадках склад каманды — тры чалавекі.

Абласныя (Мінскі гарадскі) туры рэспубліканскага чэмпіянату праходзяць у вочным фармаце з 21 верасня да 10 кастрычніка. Рэгістрацыя для ўдзелу ў абласных турах праходзіць цэнтралізавана з 8 да 15 верасня ў фармаце анлайн.

Рэспубліканскі фінал чэмпіянату «Ведаю Беларусь» праводзіцца ў канцы кастрычніка і ўяўляе сабой асабістыя залік і камандныя спаборніцтвы. У рэспубліканскім фінале чэмпіянату прымаюць удзел пераможцы абласных (Мінскага гарадскога) тураў, якія занялі першае, другое, трэцяе месцы ў кожнай з катэгорый удзельнікаў.

Зборка спілс-карт вядзецца за абмежаваны часавы перыяд, устаноўлены аргкамітэтам. Для зборкі карты Рэспублікі Беларусь адводзіцца 25 хвілін.

Для турніру па зборы пазлаў «Ведаю Беларусь» Цэнтральным камітэтам ГА «БРСМ» распрацоўваюцца дзесяць унікальных варыянтаў пазлаў з выявай аб'ектаў, звязаных з культурна-гістарычнай спадчынай Беларусі і найноўшай гісторыяй нашай краіны, стылізаваная карта Рэспублікі Беларусь і інш. Пазл уяўляе сабой мазаіку з 180 патэрнаў (элементаў).

У турніры прымае ўдзел уся каманда. Ацэньваецца хуткасць, правільнасць зборкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Хто каго?

# З'ЕХАЛІСЯ НАЙМАЦНЕЙШЫЯ

## Мінск прымае міжнародны турнір па самба на прызы Прэзідэнта Беларусі

Сёлета ў спаборніцтваў — юбілей: беларуская сталіца 25-ы раз прымае наймацнейшых самбістаў свету. На «Чыжоўка-Арэне» выступіць больш за 100 спартсменаў з 11 краін — Расіі, Румыніі, Японіі, Грэцыі, Казахстана, Узбекістана, Таджыкістана, Малдовы, Арменіі Грузіі і Беларусі. Сёлетні турнір з'яўляецца адным з этапаў падрыхтоўкі да чэмпіянату свету, які адбудзецца ў лістападзе ва Узбекістане.

Традыцыйна паядынкі абслугоўваюць найлепшыя міжнародныя арбітры. З кожным годам арганізатары ўдасканальваюць турнір. Напрыклад, у 2007 годзе Прэзідэнцкі спартыўны клуб, акрамя асноўных узнагарод, заснаваў два спецыяльныя прызы — «За волю да перамогі» і «За найлепшую тэхніку».

Добрай традыцыяй мінскага турніру стаў удзел вядомых майстроў самба. Сёлета за медалі будуць змагацца тытуляваныя беларусы: трохразовая чэмпіёнка свету Таццяна Мацко, чэмпіёны свету Марына Жарская, Іван Аніскевіч, Аляксандр Кокша. З замежных гасцей варта адзначыць чэмпіёна свету расіяніна Станіслава Скрабіна, прадстаўнікоў Грузіі чэмпіёнаў свету Вісарыёна Бярулава, Ніно Адзелашвілі. У праграму турніру таксама ўключана і баявое самба. Згодна з яго правіламі, паядынкі максімальна прыбліжаныя да рэальнага бою і з'яўляюцца мадэллю сапраўднага паядынку за правы на жыццё.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## ТАЯМНІЦЫ І АДКРЫЦЦІ

Пласты гісторыі

# 300 ГРАБНІЦ У СКАЛЕ

## Іх выявілі пры раскопках старажытнага некропаля

**У горадзе Сахаг егіпецкія археолагі раскапалі закінутыя, паводле папярэдняй ацэнкі навукоўцаў, пахаванні перыяду Старажытнага царства (каля 2000 гадоў да н. э.), гаворыцца на сайце Міністэрства па справах старажытнасцяў Егіпта.**



Грабніцы былі выяўлены пры раскопках старажытнага некропаля, яны адрозніваліся адна ад адной па архітэктурным стылі і былі высечаныя на рознай вышыні скалы.

Сярод знойдзеных пахаванняў асабліва вылучалася скошаная грабніца, якая была абсталявана фальшывымі дзвярыма і дадатковым бакавым уваходам у галерэю з магільнай шахтай.

Акрамя грабніц, археолагі знайшлі ў пустотах шмат дамашняй маёмасці, а таксама розныя прадметы, якія маглі выкарыстоўвацца ў якасці ахвярапрынашэння.

Біялогія з анатоміяй

# АДЧУЦЬ СЯБЕ ДЭЛЬФІНАМ

## Чалавек можа развіць здольнасці да эхалакацыі

**Японскія навукоўцы правялі эксперымент, які падштурхнуў іх да думкі аб тым, што чалавек можа развіць у сябе здольнасці кажаноў і дэльфінаў. Пра гэта паведаміла выданне Express.**



Навукоўцы распавялі, што людзі валодаюць простай формай эхалакацыі. У той час як, напрыклад, кажанам і дэльфінам адпаведная форма дазваляе пры дапамозе гуку вызначаць месцазнаходжанне прадмета, яго стан і нават рух.

У ходзе эксперымента, у якім узялі ўдзел 15 чалавек, даследчыкі далі ім магчымасць выкарыстоўваць прыладу для генерацыі эхалакацыйнага сігналу, які адбіваецца ад двух цыліндраў, што або нерухомыя, або круцяцца. Гэты гук чулі ўдзельнікі эксперыменту праз навушнікі.

Адзначаецца, што сігнал уключаў высокачастотныя сігналы да 41 кГц, якія чалавек не здольны пачуць. Аднак у ходзе эксперыменту ўдзельнікі змаглі вызначыць існаванне тых цыліндраў, што круцяцца, выкарыстоўваючы пры гэтым толькі гук па тэмбры і вышыні рэха.

«Мы можам атрымаць уяўленне аб тым, як адбіваецца ўспрыманне прадметаў у іншых відаў, параўноўваючы яго з ведамі, атрыманымі ў даследаваннях эхалакацыі чалавека», — распавяла адна з аўтараў даследавання, доктар філасофіі Міва Сумія.

Express адзначае, што людзі валодаюць большай колькасцю пачуццяў, чым было прынята думаць раней. Акрамя дотыку, зроку, гуку, смаку і паху чалавек таксама мае прасторавую арыентацыю, прапрыяцэпцыю (адчуванне становішча цела) і ўспрыманне болю.

За здароўе — да донца!

# СТРАТЭГІЯ ЛАКТОЗЫ

## Ці ўплывае малако на ўзровень халестэрыну?

**Яго рэгулярнае спажыванне ніяк не звязана з апошнім паказчыкам. Адпаведнае даследаванне апублікавала міжнародная каманда навукоўцаў, паведаміла Medical Xpress.**

Спецыялісты прааналізавалі папярэднія даследаванні на дадзеную тэму і выявілі, што ў тых людзей, у каго ў рацыёне заўсёды прысутнічае малако, больш высокі індэкс масы цела (IMT) у параўнанні з тымі, хто яго не п'е.

Нягледзячы на гэта, як правіла, у людзей з першай групы больш нізкі ўзровень як «добрага», так і «дрэннага» халестэрыну. Аналіз іншых буйных даследаванняў паказаў, што ў тых, хто рэгулярна спажываў малако, рызыка развіцця ішэмічнай хваробы сэрца была ніжэйшая на 14 працэнтаў.

Навукоўцы ў ходзе новага даследавання вывучылі гены, звязаныя з цярпімасцю да лактозы. Высветлілася, што людзі, генетычна схільныя да добрай яе засваяльнасці, мелі абсалютна нармальныя паказчыкі ўзроўню халестэрыну. У іх магла быць лішняя вага, але гэта ніяк не ўплывала на рызыку хвароб сэрца. Акрамя таго, у іх быў больш нізкі ўзровень «добрага» і «дрэннага» халестэрыну.



«Усё гэта сведчыць пра тое, што адмова ад малочных прадуктаў не з'яўляецца дакладнай стратэгіяй для прафілактыкі сардэчна-сасудзістых захворванняў. Мы не выявілі такую ўзаемасувязь, прааналізаваўшы паказчыкі здароўя больш за 1,9 мільёна чалавек. Часам прычына тоіцца выключна ў генетыцы», — лічаць медыкі.

Таксама ў папярэдніх даследаваннях выказвалася здагадка, што ўжыванне малочных прадуктаў павышае рызыку ўзнікнення дыябету. У новай рабоце навукоўцы не знайшлі ніякіх пераканаўчых доказаў гэтай гіпотэзы.

Каго мы бачым!

# «ШАКАЛАДКА» НА БАЛОЦЕ

## Litoria mira вонкава нагадвае аўстралійскую драўняную жабу

**Вучоны Стыў Рычардс знайшоў сваячку аўстралійскай драўнянай жабы ў трапічных лясах Новай Гвінеі і назваў яе Litoria mira. Пра гэта піша The Guardian.**

Упершыню жабу колеру какавы навуковец выявіў у 2016 годзе ў неверагодна складаным асяроддзі — на балоцістай тэрыторыі, якая рэгулярна цярпіць ад паводак, з маскітамі і кракадзіламі.

Рычардс паспешна дастаў узоры новага віду: ён разварушыў гняздо шэршняў, пасля чаго аўстралійцу прыйшлося літаральна ўцякаць з месца.



Пасля многіх гадоў складаных даследаванняў і генетычных аналізаў вучоны і яго калегі могуць з упэўненасцю сказаць, што Litoria mira — новы від. Litoria mira вонкава нагадвае аўстралійскую драўняную жабу, за выключэннем яе бліскучай карычневай скуры. Гэта найбліжэйшы сваяк аўстралійскай зялёнай квакшы.

Але генетычны аналіз паказвае, што Litoria mira эвалюцыяніравала, каб стаць генетычна адрознай да такой ступені, каб гэтыя два віды не змаглі спарвацца.

Уласна, галоўнае пытанне заключалася ў тым, а ці не былі шакаладныя жабы аўстралійскімі зялёнымі драўнянымі жабамі, якія часам могуць быць карычневыя і, як вядома, жывуць у Новай Гвінеі.

Сярод фізічных адрозненняў — дробныя плямкі за вачыма шакаладнай жабы, а яшчэ яна крыху меншая, чым аўстралійская зялёная драўняная, — ад 7 да 8 сантыметраў у дарослым узросце.

**Цімкаўляне — так называюць сябе жыхары аграгарадка Цімкавічы, што ў Капыльскім раёне. Вымаўляюць яны сваё імя з годнасцю, усведамляючы, што сфарміравана і ўмацавана яно многімі пакаленнямі землякоў.**





# ЗЛУЧАНЫЯ СА СТАГОДДЗЯМІ

Даўно тое было. Дакументы сведчаць, што існуюць згадкі пра Цімкавічы ажно з 1499 года. Слаўнае было гэтае мястэчка на ажыўленым скрыжаванні шляхоў да Нясвіжа, Капыля, Слуцка, Пінскага Палесся. Не абыходзілі бокам яго жыхароў ні беды, ні радасці. На працягу пяці наступных стагоддзяў вятры гісторыі неслі сюды не толькі пах мірна квітнеючых садоў, але і горкі смурод ваенных пажараў.

Цімкаўляне з гонарам называюць імёны сваіх землякоў, якія праславілі Айчыну як мірныя працаўнікі і мужныя абаронцы. Пералік імёнаў славутых ураджэнцаў будзе вельмі доўгі. Скажу адно, што ў гэтым ганаровым спісе вядомыя земляробы, вучоныя, пісьменнікі, дзеячы мастацтва, воіны — Героі Савецкага Саюза...

Сённяшнія Цімкавічы — сучасны аграгарадок, жыхары якога працягваюць слаўныя традыцыі сваіх папярэднікаў.

Прыведзеныя фотаздымкі перадаюць тое, што я ўбачыў, пабываўшы ў аграгарадку. Строгая архітэктура сучасных будынкаў і мілы выгляд дагледжаных вясковых хат, помнік воінам-абаронцам і аднаўлены будынак царквы, мемарыяльны камень з высечанымі радкамі цімкаўляніна Кузьмы Чорнага: «Родныя мае мясціны... Тут жывуць усе мае персанажы...» Усё гэта заўважана і занатавана падчас экскурсіі, якую правяла знаўца гэтых мясцін, **старшыня Цімкавіцкага сельскага выканкама Алена ВОСТРЫКАВА** (*на адным з фота*).

**Яўген ПЯСЕЦКІ,**
**фота аўтара.**










## ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «Встречайте любимую вкуснятину в новом дизайне и выигрывайте призы! Тур 4»

В настоящих правилах проведения рекламной игры «Встречайте любимую вкуснятину в новом дизайне и выигрывайте призы! Тур 4» (далее – Правила) нижеперечисленные термины имеют следующее значение:

**Скретч-карта** – карта с нанесенным уникальным кодом под специальным защитным слоем.

**Интернет-сайт** – www.promo-cat.by

**Регистрация** – заполнение Регистрационных данных (обязательные поля) на Интернет-сайте:

• персональные данные: фамилия, имя, отчество (если таковое имеется),

• номер мобильного телефона Участника в международном формате +375 (XX) XXXXXXX.

• уникальный код, нанесенный под специальным защитным слоем Скретч-карты;

• адрес электронной почты.

**1. Организатором рекламной игры** является Общество с ограниченной ответственностью «ЭфСиБи Бел» (далее – Организатор), УНП 193185741.

Юридический адрес: Республика Беларусь, г. Минск, пер. Козлова, 25, пом. 22.

Электронный адрес: info@fcb.by

**2. Наименование рекламной игры:** «Встречайте любимую вкуснятину в новом дизайне и выигрывайте призы! Тур 4».

3. **Территория проведения игры**: магазины «GREEN» на территории Республики Беларусь (далее – магазины «GREEN»).

**4. Срок начала и окончания рекламной игры,** включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения рекламной игры: с 13 сентября 2021 года по 29 октября 2021 года.

**5. Состав комиссии по проведению рекламной игры:**

Председатель комиссии:

Кривоногова Надежда Александровна – ведущий специалист по работе с клиентами ООО «ЭфСиБи Бел»;

Члены комиссии:

Казак Вадим Анатольевич – специалист по рекламе ООО «Адверком»;

Чвирова Елена Николаевна – специалист по рекламе ООО «ЭфСиБи Бел»;

Корпик Екатерина Игоревна – специалист по рекламе ООО «ЭфСиБи Бел»;

Страх Александра Вадимовна – специалист по рекламе ООО «ЭфСиБи Бел».

6. **Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится рекламная игра:** Игровые товары, реализуемые в магазинах «GREEN», расположенных на территории Республики Беларусь в период с 13 сентября 2021 года по 26 сентября 2021 года включительно (далее – Игровой товар):

| | |
|---|---|
| **Консервы для кошек Феликс Аппетитные кусочки, 85 г** | |
| 7 613 032 721 022 | Felix Аппет кус. Корм конс. полнорац. для взр. кошек с индейкой в желе |
| 7 613 032 720 995 | Felix Аппет кус. Корм конс. полнорац. для взр. кошек, с курицей в желе |
| 7 613 032 721 688 | Felix Аппет кус. Корм конс.полнорац. для взр. кошек, с курицей и томатами в желе |
| 7 613 032 721 657 | Felix Аппет кус. Корм конс. полнорац. для взр. кошек с лососем в желе |
| 7 613 033 575 730 | Felix Аппет кус. Корм конс. полнорац. для взр. кошек, с кроликом в желе |
| 7 613 033 574 764 | Felix Аппет кус. Корм конс. полнорац. для взр. кошек с говядиной в желе |
| 7 613 034 263 131 | Felix Аппет кус. Корм конс. полнорац. для взр. кошек, с форелью в желе |
| 7 613 034 262 868 | Felix Аппет кус. Корм конс. полнорац. для взр. кошек, с ягненком в желе |
| 7 613 036 010 221 | Felix Аппет кус. Корм конс. полнорац. для котят, с курицей в желе |
| **Консервы для кошек Феликс Sensations в желе, 85 г** | |
| 7 613 034 482 587 | Felix Sensations в желе. Корм конс. полнорац. для взросл. кошек с курицей в желе с морковью |
| 7 613 034 482 600 | Felix Sensations в желе. Корм конс. полнорац. для взросл. кошек с говядиной в желе с томатами |
| 7 613 034 482 624 | Felix Sensations в желе. Корм конс. полнорац. для взросл. кошек, с лососем в желе с добавлением трески |
| 7 613 034 482 778 | Felix Sensations Корм конс. полнорац. для взр. кошек, с уткой в желе со шпинатом |
| **Консервы для кошек Феликс Sensations в соусе, 85 г** | |
| 7 613 034 957 894 | Felix Sensations в соусе. Корм конс. полнорац для взр. кошек, с треской в соусе с томатами |
| 7 613 034 957 658 | Felix Sensations в соусе. Корм конс. полнорац. для взр. кошек, с уткой в соусе с морковкью |
| 7 613 034 958 563 | Felix Sensations в соусе. Корм конс. полнорац. для взр. кошек с говядиной в соусе с томатами |
| 7 613 034 957 917 | Felix Sensations в соусе. Корм конс. полнорац. для взр. кошек, с индейкой в соусе со вкусом бекона |
| **Консервы для кошек Феликс Двойная вкуснятина, 85 г** | |
| 7 613 035 419 322 | Felix Аппет. кус. 2-я Вкус. Корм конс. полнорац. для взр. кошек, с говяд/дом. птицей, в желе |
